За чысты Моталь!

Выяўлена астма? Рыхтуйцеся да прастуд

Рубель пайшоў ад грыўні

МС

СТАР.3

СТАР.6

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

9 СНЕЖНЯ 2015 г. СЕРАДА № 238 (28096) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыбыў з афіцыйным візітам у В'етнам

Сёння Аляксандр Лукашэнка правядзе перагаворы з Прэзідэнтам В'етнама Чыонг Тан Шангам, сустрэнецца з генеральным сакратаром Камуністычнай партыі Нгуен Фу Чонгам і прэм'ер-міністрам Нгуен Тан Зунгам.

БЕЛАРУСЬ – В'ЕТНАМ:
гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва

Рэспубліка Беларусь

Сацыялістычная Рэспубліка В'етнам

В'етнам - традыцыйны гандлёвы партнёр Беларусі ў Азіяцкім рэгіёне.



БЕЛАРУСЬ ПАСТАЎЛЯЕ Ў В'ЕТНАМ
- калійныя ўгнаенні
- машынакамплекты грузавой тэхнікі
- кар'ерныя самазвалы
- шыны
- трактары
- падшыпнікі
- металапрадукцыю
- харчовыя прадукты

В'ЕТНАМ ПАСТАЎЛЯЕ Ў БЕЛАРУСЬ
- сродкі сувязі
- офіснае абсталяванне
- морапрадукты
- рыс
- абутак
- адзенне
- натуральны каўчук
- чай
- каву

Крыніца: пасольства Беларусі ў В'етнаме, Белстат. © Інфаграфіка БЕЛТА

«ЛЕДЗЯНЫ ПАКОЙ» ДЛЯ СВЯТОЧНАГА НАСТРОЮ

Фота Надзеі БУЖАН.

У апошні час Новы год і папярэднія яму тыдні ў многіх беларусаў перасталі асацыявацца з маразамі, снегам і льдом. Усё часцей снежань прыносіць толькі халодныя дажджы і слоту. Але зарадзіцца пераднавагоднім настроем нават у такое надвор'е жыхарам сталіцы цяпер стане прасцей — у гандлёвым цэнтры ALL на Даўгінаўскім тракце з'явіўся так званы «ледзяны пакой», у якім пара года не залежыць ад навакольнага асяроддзя.

СТАР. 2

ЦЫТАТА ДНЯ

Пётр ПРАКАПОВІЧ, старшыня Савета па развіцці прадпрымальніцтва:

«Сёння, ва ўмовах знешняга крызісу, калі мы не можам разлічваць на тое, што нешта ў свеце рэзка зменіцца, ды яшчэ ў наш бок, трэба востра ставіць пытанне аб павелічэнні ўнутранага попыту за кошт беларускіх тавараў і паслуг. Мы павінны правільна развіваць беларускі рынак. Калі мы завалодаем яго, мы аўтаматычна завалодаем і рынак усяго ЕАЭС, таму што ўсё, што трэба нам, трэба і там — і ў вялікіх аб'ёмах».

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 3°
Віцебск	+ 1°
Гомель	+ 2°
Гродна	+ 3°
Магілёў	+ 1°
Мінск	+ 2°

Курсы замежных валют, установленыя НБ РБ з 09.12.2015 г.

Долар ЗША	18260,00	▲
Еўра	19839,00	▲
Рас. руб.	263,29	▼
Укр. грыўня	793,05	▲

УДЗЯЧНАСЦЬ ЗА СУМЛЕННУЮ ПРАЦУ

Прэм'ер-міністр Андрэй Кабякоў уручыў дзяржаўныя ўзнагароды прадстаўнікам працоўных калектываў.

«Па даручэнні Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі я ўручаю заслужаныя дзяржаўныя ўзнагароды найлепшым прадстаўнікам працоўных калектываў нашай краіны. Гэтых узнагарод вы ўдастоены за шматгадовую плённую працу, высокі прафесіяналізм, узорнае выкананне службовых абавязкаў», — сказаў Андрэй Кабякоў.

Кіраўнік урада падкрэсліў, перадае карэспандэнт БЕЛТА, што асаблівую ўвагу Прэзідэнт надае харчовай бяспецы. Таму працаўнікі вёскі складаюць значную частку сярод узнагароджаных. «З задавальненнем адзначу, што за пяць гадоў уведзена ў эксплуатацыю і тэхнічна перааснашчана больш за тысячу малочнатаварных комплексаў. Прадукцыя вёскі стала важным экспартным артыкулам краіны. Толькі за апошнюю пяцігодку экспарт харчовых тавараў склаў $25 млрд. Асвойваюцца новыя рынкі збыту», — адзначыў Андрэй Кабякоў.

Высокімі ўзнагародамі адзначана праца прадстаўнікоў нафтахімічнай і газавай галін, якія забяспечваюць рэспубліку высакаякаснымі нафтапрадуктамі і неабходнымі энерганосьбітамі. Сярод узнагароджаных і медыцынскія работнікі. Асобную ўдзячнасць ён выказаў групе ўзнагароджаных за значны ўклад у стварэнне і развіццё Еўразійскага эканамічнага саюза. Словы ўдзячнасці ён адрасаваў таксама вучоным, выкладчыкам, настаўнікам. Дзяржаўныя ўзнагароды былі ўручаны таксама вялікай групе работнікаў лясной гаспадаркі. Уклад мастакоў у развіццё нацыянальнага мастацтва, духоўнае і эстэтычнае выхаванне грамадзян таксама адзначаны на высокім узроўні. Усяго дзяржаўныя ўзнагароды з рук кіраўніка беларускага ўрада сёння атрымалі больш як 100 чалавек.

АДВАРОТНЫ БОК НАВАГОДНІХ «СПЕЦЭФЕКТАЎ»

Зусім хутка пачнецца сезон «артылерыйскіх кананад» на вуліцах — зімовыя святы ў нас многія любяць адзначаць вельмі гучна. Хоць лік пацярпелых ад піратэхнікі штогод вымяраецца дзясяткамі, гэта не спыняе аматараў спецэфектаў. Карэспандэнт «Звязды» распытаў памочніка міністра па надзвычайных сітуацыях Віталя Навіцкага пра тое, як жа бяспечна абыходзіцца з піратэхнікай і чым заканчваецца нават нязначнае адступленне ад правілаў яе выкарыстання.

НА БАЛЬНІЧНЫ ЛОЖАК ПА ЎЛАСНЫМ ЖАДАННІ

Летась 12-гадовы хлапчук разам з сябрам набылі ў гомельскім кіёску петарды і пайшлі іх «выпрабоўваць» на школьным двары. На яе тэрыторыі пабудавана газаразмеркавальная падстанцыя, на некаторай адлегласці ад якой быў выкапаны тэхналагічны калодзеж, дзе змяшчалася запорная газавая арматура. У люку, які закрываў гэты калодзеж, былі прасвідраваны невялічкія дзіркі для вентыляцыі на выпадак уцечкі газу. Двое падлеткаў не прыдумалі нічога лепшага, як запусціць у гэты калодзеж петарду. Тут жа раздаўся выбух, хваля ад якога шпурнула металічнае века ад калодзежа на паўтара метра — якраз у бок аднаго з хлопцаў, якога і даставілі пасля ў абласную бальніцу з апёкамі твару і чэрапна-мазгавой траўмай.

— Колькасць пажараў з-за піратэхнікі штогод зніжаецца. А вось няшчасных выпадкаў ад яе няправільнага выкарыстання менш не становіцца. І пакутуюць ад гэтага не толькі дзеці, але і дарослыя.

Шумна адзначыць навагоднюю ноч вырашыў жыхар Рагачова. Ён запусціў петарду, але не разлічыў, і піратэхніка стрэліла чалавеку прама ў твар. Скончылася гэта апёкамі першай ступені скуры, пашкоджаннем рагавіцы левага вока. У цяжкім стане небараку шпіталізавалі ў Гомельскую абласную бальніцу.

КІТАЙСКАЯ ГРАМАТА «ШЭРАЙ» ПІРАТЭХНІКІ

Год ад года ратаўнікі разам з міліцыянерамі праводзяць рэйды па гандлёвых пунктах, дзе прадаецца піратэхніка. Але прапанаваць купіць яе з рук могуць дзе заўгодна. Напрыклад, летась да аўтара гэтых радкоў «падкацілі» з такой прапановай напярэдадні Новага года на аўтастаянцы ля аднаго са сталічных гіпермаркетаў. Праўда, пачуўшы прамым тэкстам у адказ, што я не збіраюся купляць невядома што незразумела ў каго, незадачлівы гандляр да мяне цікавасць рэзка страціў.

СТАР. 2

■ Па той бок прылаўка

СВАБОДНАЯ КАСА!

Сітуацыя з напаўняльнасцю ў гандлёвых цэнтрах пад кантролем

Паводле інфармацыі Міністэрства гандлю, зараз узровень фактычнага выкарыстання гандлёвых месцаў у гандлёвых цэнтрах складае каля 80 працэнтаў. Пры гэтым сярэдні кошт арэнды квадратнага метра з пачатку года знізіўся на 30 працэнтаў і складае каля 20 еўра.

У тых умовах, якія складваюцца, уласнікі плошчаў прымаюць актыўныя захады па прыцягненні арандатараў. Часам пры заключэнні дагавора арэнды па першым часе плата зусім не бярэцца, аплачваюцца толькі камунальныя плацяжы, гавораць у міністэрстве.

З мэтай карэкціроўкі сітуацыі, павелічэння долі тавараў айчыннай вытворчасці ў рознічным тавараабароце Міністэрства гандлю выйшла з прапановай ва ўрад устанавіць для індывідуальных прадпрымальнікаў і юрыдычных асоб, незалежна ад формы ўласнасці, якія вядуць выключна рэалізацыю тавараў айчыннай вытворчасці, выкарыстанне да базавай стаўкі арэнднай платы паніжальных каэфіцыентаў (0,4 і 0,5).

Сяргей РАСОЛЬКА.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

Рэкордныя паводкі ў Англіі звязаны з глабальным пацяпленнем

Зацяжныя ліўні ў Вялікабрытаніі выкліканы анамаліямі ў заходняй частцы Ціхаакіянскага рэгіёна, дзе ў апошні час таксама значна пачасціліся дажджы. Пра гэта заявілі ў Галоўнай метэаралагічнай службе Злучанага Каралеўства. Прычынай апошніх можа быць больш хуткае, чым раней, раставанне арктычных ільдоў. У мястэчку Тырлмер у графстве Камбрыя, найбольш пацярпелым ад паводкі, менш чым за двое сутак выпала 405 мм ападкаў, што амаль у два разы вышэй за месячную норму. Усяго за апошнія дні затопленымі аказалася больш за 5 тыс. дамоў па ўсёй краіне, каля 60 тыс. засталіся без электрычнасці. Закрыта большасць аўтамагістраляў, перапынены чыгуначныя зносіны з Шатландыяй. Стыхія прывяла да эвакуацыі тысяч жыхароў паўночнага захаду Англіі, сама меней два чалавекі загінулі.

Турцыя адмовілася вывесці войскі з Ірака

Анкара не будзе выводзіць з Ірака свае ваенныя падраздзяленні. Пра гэта паведамляюць інфармагенцтвы са спасылкай на заяву неназванага прадстаўніка турэцкага ўрада, зробленую заходнім журналістам у Стамбуле. У сваю чаргу віцэ-прэм'ер Турцыі Нуман Куртулмуш на брыфінгу ў Анкары заявіў пра павагу Турцыі да тэрытарыяльнай цэласнасці Ірака. Ён патлумачыў ваенную прысутнасць сваёй краіны на тэрыторыі суседа тым, што гэтая мера «накіравана супраць ІД, што супадае з інтарэсамі Ірака». 4 снежня стала вядома, што батальён турэцкіх салдат размешчаны на поўначы Ірака паблізу захопленага «Ісламскай дзяржавай» горада Масул. Войскі забяспечаны бранятэхнікай. Афіцыйная мэта місіі — падрыхтоўка мясцовага апалчэння для баёў з ІД. МЗС Ірака кваліфікаваў дзеянні Турцыі як уварванне. Багдад адхіліў магчымасць правядзення няўзгодненай ваеннай аперацыі і запатрабаваў неадкладнага вываду турэцкіх войскаў.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

Спажыванне бульбы можа знізіць рызыку раку страўніка

Новае даследаванне паказала: уключэнне ў рацыён вялікай колькасці белай гародніны, такой як бульба, цыбуля і капуста, можа знізіць верагоднасць раку страўніка на траціну. А піва, спіртныя напоі, соль і кансервы павялічваюць рызыку анкалогіі. Навукоўцы з Універсітэта Чжэцзян прааналізавалі вынікі 76 даследаванняў аб сувязі дыеты і раку страўніка. У эксперыменце ўдзельнічалі больш як 6,3 мільёна чалавек. Навукоўцы выявілі: кожныя 100 грамаў садавіны (эквівалентна прыкладна палове яблыка), якія людзі з'ядалі штодня, зніжалі рызыку на 5%. Спажыванне 50 міліграмаў вітаміну С, што адпавядае дзвюм бульбінам, змяншала верагоднасць анкалогіі на 8%. У той жа час кожныя 5 грамаў (чайная лыжка) солі павялічвалі верагоднасць раку на 12%.

КАРАТКА

Рускі біяграфічны інстытут прысудзіў Прэзідэнту Беларусі Аляксандру Лукашэнку званне «Чалавек года — 2015» ў намінацыі «Міжнародныя адносіны» за ўмацаванне еўразійскага супрацоўніцтва і плённае супрацоўніцтва з Расіяй.

Беларусь і В'етнам у рамках двухбаковага бізнес-форуму, які праводзіцца ў Ханоі, падпісалі амаль два дзясяткі дакументаў на пастаўку беларускай прадукцыі на $24 млн.

Рымска-каталіцкая царква ў Беларусі пакуль не ведае, хто заменіць апостальскага нунцыя архіепіскапа Клаўдыа Гуджэроці, які завяршае сваё служэнне ў краіне.

Запрашаць у дзіцячыя садкі на навагоднія ранішнікі прыватнага Дзеда Мароза можна толькі па ўзгадненні з кіраўніцтвам установы і бацькоўскім камітэтам.

Гала-канцэрт «зорак» сусветнай оперы, які пройдзе 20 снежня ў час VI Мінскага міжнароднага Каляднага опернага форуму, збярэ вакалістаў 15 тэатраў з 14 краін.

Прызавы фонд мінскага чэмпіянату Еўропы па шахматах па бліцы і рапідзе складзе больш як 30 тыс. еўра. Шахматысты з 31 краіны падалі заяўкі на ўдзел, у бліцы выступяць 675 спартсменаў, у рапідзе — 802.

■ Я зноў выбіраю «Звязду»

КАБ НЕ ЗАБЫЦЬ МАТЧЫНА СЛОВА

Іван КЛІМКО, начальнік цэха па вытворчасці чмялёў, пчол і апыленні сельскагаспадарчых культур унітарнага прадпрыемства «Агракамбінат Ждановічы»:

— Са «Звяздой» я сябрую яшчэ з савецкіх часоў. Перавагу аддаю менавіта гэтай газеце, бо яна выходзіць на беларускай мове і не дае магчымасці яе забываць. Я родам са Стаўбцоўшчыны. У школе ў нас выкладала родную мову настаўніца, якой я вельмі ўдзячны за тое, што навучыла шанаваць матчына слова, слова маіх продкаў, якія спакон веку жылі на Стаўбцоўскай зямлі. Зямлі, якая дала краіне, свету славутага пісьменніка Якуба Коласа.

Падабаецца, што «Звязда» паважае свайго чытача, не дазваляе сабе вольнай трактоўкі падзей: толькі аб'ектыўная інфармацыя, абгрунтаваныя факты. А калі падымаецца нейкая праблема, то газета дае магчымасць выказацца ўсім, каго яна тычыцца. Так бы мовіць, даследуе пытанне з розных бакоў, не навязвае чытачу нейкія аднабаковыя погляды.

Хочацца, каб больш увагі любімая газета звяртала і на галіну пчалярства ў Беларусі, яе праблемы, перспектывы развіцця. Сёння ў гэтым кірунку працуе шмат грамадскіх арганізацый, але яны разрозненыя, і кожная з іх цягне, так бы мовіць, коўдру на сябе. На маю думку, павінна быць агульная палітыка, як на ўзроўні пчаляроў, так і на ўзроўні дзяржавы.

Мне здаецца, што «Звязда» павінна таксама асвятляць усё самае лепшае ў розных сферах жыццядзейнасці, прапагандаваць перадавы вопыт, што дапаможа стаць больш заможнымі як людзям, так і краіне.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на I паўгоддзе 2016 года!

5 разоў на тыдзень!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА

Падпісацца на газету можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала РУП «Белпошта»; праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

Падпіска, дарэчы, можа стаць добрым падарункам для вашых родных і блізкіх, для вашых сяброў.

■ Тры пытанні да ўлады

ІМКНЁМСЯ ЗРАБІЦЬ ГОРАД УТУЛЬНЫМ ДЛЯ КОЖНАГА

Сёлета споўніўся год, як Бабруйскі гарвыканкам узначаліў Андрэй КАВАЛЕНКА. Людзі неаднойчы адзначалі, што твар горада змяніўся ў лепшы бок. Бабруйск стаў больш чыстым, прыгожым, утульным. А калі мэр сеў на веласіпед, каб разам з інвалідамі-калясачнікамі праінспектаваць стан гарадскіх дарог, у інтэрнэце разгарнулася цэлая палеміка на гэты конт. Жыхарам імпануе, што іх граданачальнік дэманструе сваю адкрытасць для стасункаў і заклапочаны паляпшэннем умоў для пражывання гараджан. У тым ліку і з абмежаванымі магчымасцямі.

— Калі рабіць нейкія высновы, што найбольш значнае зроблена для бабруйчан за час вашага кіраўніцтва?

— Нядаўна справіла навасэлле гарадская станцыя хуткай і неадкладнай медыцынскай дапамогі, адкрыта водалячэбніца ў гарадской паліклініцы №1, касметалагічны кабінет у цэнтральнай бальніцы, устаявана сучаснае абсталяванне ў шэрагу іншых медыцынскіх устаноў. Дзякуючы ўдасканаленню матэрыяльна-тэхнічнай базы, укараняюцца сучасныя метады дыягностыкі, лячэння і рэабілітацыі. Вядома, што найлепшы спосаб пазбегнуць захворвання — гэта яго прафілактыка. Сёлета пасля рэканструкцыі ўведзены ў дзеянне стадыён імя Пракапенкі, зала барацьбы ў дзіцячай юнацкай школе алімпійскага рэзерву №3. На вуліцы Лынькова пабудавана пляцоўка з вулічнымі трэнажорамі, а ў раёне Зорнага праезду створаны ўмовы для заняткаў воркаўтам. Жыллёвымі арганізацыямі адрамантавана звыш 700 дзіцячых, спартыўных і гаспадарчых пляцовак, зроблены рамонт некалькіх тысяч квадратных метраў асфальтабетоннага пакрыцця.

Мы імкнёмся зрабіць горад утульным для жыхароў, у тым ліку і для людзей з абмежаванымі магчымасцямі. І той самы веласіпедны аб'езд рабіўся дзеля таго, каб высветліць, якія існуюць недахопы. Наогул працы па паляпшэнні стану дарог, праездаў, аб'ектаў вонкавага добраўпарадкавання надаецца шмат увагі. Зроблены капрамонт вуліцы Чырвонаармейскай, часткова вуліц Ванцэці і Арджанікідзе. Паступова знешні выгляд горада мяняецца ў лепшы бок.

— Нельга не заўважыць узорную чысціню на вуліцах горада. Але смецце мала сабраць, яго яшчэ трэба перабраць, перапрацаваць. Што робіцца ў гэтым кірунку?

— Для паляпшэння экалагічнага стану і павелічэння аб'ёму здабывання другасных матэрыялаў на палігоне «Бабіна» ўведзена ў эксплуатацыю лінія сартавання адходаў магутнасцю 20 тысяч тон смецця ў год. Лінія набыта за сродкі ДУ «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў» і каштуе болей чым 1,4 мільярда рублёў. Гэта абсталяванне дазволіла павялічыць колькасць здабывання матэрыяльных рэсурсаў на 80 тон у месяц. За кошт бюджэтных і ўласных сродкаў «Аператар» абнавіў свой аўтапарк для вывазу цвёрдых адходаў і набыў вялікую колькасць кантэйнераў для збору цвёрдых камунальных адходаў і другасных матэрыяльных рэсурсаў.

— Бабруйск, як гаворыцца ў бессмяротнай кнізе Ільфа і Пятрова «Залатое цяля», горад высокай культуры, куды імкнуліся «дзеці» лейтэнанта Шміта. Якія поспехі назіраюцца ў культурным плане?

— На шчасце, з той катэгорыяй насельніцтва, якая згадваецца ў рамане, у нас вялікай праблемы няма. У горадзе паспяхова працуе каардынацыйны савет па барацьбе са злачыннасцю, карупцыяй і наркаманіяй. А што датычыцца нашых поспехаў у культурным жыцці, то тут ёсць чым ганарыцца. Фестываль народнага мастацтва «Вянок дружбы», які з'яўляецца візітнай карткай горада, сабраў сёлета 18 краін-удзельніц. Гэта вельмі добры паказчык. Унікальны праект для прафесіяналаў — пленэр «Арт-Жыжаль» — дазволіў папоўніць фонды мастацкага музея работамі майстроў 18 краін. Мы ганарымся тым, што ў нашым горадзе працуе больш за 70 калектываў самадзейнай аматарскай творчасці са званнем «заслужаны», «народны», «узорны». Іх удзельнікі дэманструюць высокі ўзровень выканаўчага майстэрства і годна прадстаўляюць культуру горада на галоўных абласных і рэспубліканскіх мерапрыемствах. Дастаткова адзначыць, што аматарскі калектыў «Юнацтва» быў запрошаны для ўдзелу ў святочным канцэрце ў гонар інаўгурацыі Прэзідэнта Беларусі.

Нэлі ЗІГУЛЯ. *zigulya@zviazda.by*

Новае прачытанне братэрскіх повязяў

У Дзяржаўнай бібліятэцы Дзяржаўнага культурнага цэнтра Туркменістана ўчора прайшоў «круглы стол» з удзелам беларускіх і туркменскіх пісьменнікаў

Самыя розныя пытанні хвалявалі літаратараў краін, паяднаных паміж сабою даўнімі вузамі сяброўства. Паэты, празаікі вялі гаворку пра ўзаемныя пераклады, пра гістарычныя традыцыі літаратурнага пабрацімства, згадвалі першапраходцаў на ніве літаратурнай дружбы.

Неаднойчы гучала імя Валянціна Лукшы, шматгадовага дырэктара мінскага выдавецтва «Юнацтва», які надзвычай многа зрабіў дзеля пашырэння прасторы знаёмства беларускага чытача з дзіцячай літаратурай Туркменістана. Менавіта дзякуючы яго руплівасці на мове Купалы і Коласа ўбачылі свет дзіцячыя кнігі туркменскіх аўтараў Каюма Тангрыкуліева, Анна Кавусава, Агагельды Аланазарава, Курбана Чаліева і іншых аўтараў. У серыі кніг, прысвечаных дзіцячым літаратурам народаў Савецкага Саюза, пабачыў свет і туркменскі том.

— Добра ведаючы беларускую літаратуру, асабіста я і сёння вельмі ўдзячны за ўвагу да нас, туркменаў, — зазначыў на «круглым стале» **Агагельды АЛАНАЗАРАЎ.** — Мне прыемна было літаральна толькі што разглядаць свежы нумар газеты «Літаратура і мастацтва», дзе змешчаны ўрывак з майго рамана «Цюлень» у перакладзе Ірыны Качатковай і мае вершы ў перакладзе Юліі Алейчанкі. Для мяне гэта вельмі пачэсна — быць прадстаўленым беларускаму чытачу. Ужо ў постсавецкі час у Мінску выйшла дарагая мне кніга «Вясёлая азбука», па якой туркменская дзятва вучыцца чытаць — зразумела, па кнізе на мове арыгінала. А цяпер, як бачу, і беларускія хлопчыкі і дзяўчаткі будуць засвойваць літары і словы па маёй вершаванай кнізе ў перакладзе вашага вядомага творцы Віктара Гардзея. Нізкі паклон за гэта беларусам!

— У свой час менавіта Ашхабад натхніў мяне на напісанне апавядання «Ідэальны чытач», — расказаў на «круглым стале» **дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура», празаік і паэт Алесь БАДАК.** — Веру, што знайду ў Ашхабадзе, Туркменістане новыя сюжэты, новыя тэмы, новыя вобразы і мастацкія сімвалы. Бачу ўжо з другой сустрэчы з вашай краінай, дарагія туркменскія сябры, як імкліва развіваецца Туркменістан. Прыемна, што развіццё гэта праходзіць у цесным эканамічным і палітычным партнёрстве з Беларуссю.

Сапраўды, жыццё падказвае новыя сюжэты і новыя тэмы. Ужо сённяшнія дні становяцца гісторыяй у стасунках Туркменістана і Беларусі, гісторыяй новай і не менш цікавай, чым учарашнія дні. Пра гэта гаварылі на «круглым стале» ў Дзяржаўнай бібліятэцы Туркменістана пісьменнікі Газель Шакулієва, Атаджан Таган, Аразгулы Анаеў. Празаік Атаджан Таган успомніў сваіх сяброў — беларускіх пісьменнікаў Алеся Жука, Генадзя Пацюенку. «Перадаючы ім братэрскае прывітанне з каракумскай старонкі, — сказаў **Атаджан ТАГАН**, — я спадзяюся на туркменскае прачытанне іх новых твораў. Увогуле як пісьменнік, які высока ацэньвае ў кантэксце сусветнай менавіта беларускую літаратуру, найперш — за высокія творчыя памкненні ў адлюстраванні праўды жыцця Васілём Быкавым, Іванам Шамякіным, згаданым маім сябрам Алесем Жуком, я спадзяюся, што і ў нас з'явіцца нямала перакладаў сучаснай беларускай прозы і паэзіі на мову неўміручага Махтумкулі».

Кастусь ЛАДУЦЬКА,
г. Ашхабад, Туркменістан.

Фота Надзеі БУЖАН.

Па словах Юрыя ГІГІНЯКА, адзінае ратаванне ног ад лютых маразоў Антарктыкі — драўляныя хэндмэйд-тапачкі. Адну пару палярнік падарыў ледзяному пакою.

«ЛЕДЗЯНЫ ПАКОЙ» ДЛЯ СВЯТОЧНАГА НАСТРОЮ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

На 24-х квадратных метрах размяшчаюцца сані, канапа, трон і камін, заселены пакой жывёламі, якія традыцыйна асацыююцца з зімой, у прыватнасці, зайцамі. Усё гэта зроблена з лёду, а захоўвае інтэр'ер тэмпература ў мінус 10 градусаў. Без цёплай вопраткі пратрымацца ў такой казачнай рэзідэнцыі цяжка. Дапаўняе экспазіцыю атмасферная падсветка. Усю «мэблю» можна кранаць і нават выкарыстоўваць па прамым прызначэнні, праўда, не надта доўга — каб не прастудзіцца.

— Ідэя з'явілася проста — мы хацелі зрабіць нешта такое, чаго яшчэ не было ў Беларусі, — распавядае **аўтарка ідэі ледзянога пакоя, спецыяліст па маркетынгу кампаніі-забудоўшчыка «А-100 Дэвелапмент» Вольга ЦІШКЕВІЧ.** — Выпадкова ўбачылі працы студыі ледзянога мастацтва Nice, якая потым і стала выканаўцам праекта, і вырашылі, што гэта будзе цікава. Ад моманту распрацоўкі макета і да завяршэння работ над скульптурамі прайшло два месяцы. Наведванне пакою будзе для ўсіх бясплатным, працаваць ён будзе штодзень з 10 раніцы да самага вечара, а сам праект працягнецца да 15 студзеня. Магчыма, па завяршэнні выставім скульптуры на вуліцы.

Па словах **кіраўніка студыі ледзянога мастацтва Nice Аляксея АЎСЕЙКІ**, працэс стварэння ледзяных скульптур — не самая простая задача. Нават вада, якая пасля прымае выбраную мастаком форму, рыхтуецца па спецыяльнай тэхналогіі — у яе павінен быць пэўны хімічны састаў і асаблівыя характарыстыкі. Усяго падчас працы было выкарыстана шэсць тон вадкасці, а некаторыя экспанаты важаць каля тоны. Стваральнік пакоя абяцае, што за больш як месяц фігуры не сапсуюцца і не зменяць форму, калі толькі чыя-небудзь неахайнасць не пакіне зайцаў без вушэй.

Для будучых наведнікаў пакоя стваральнікі падрыхтавалі адмысловую праграму: штодзень каля пакоя будзе «дзяжурыць» Дзед Мароз, тут жа яму можна будзе пакінуць ліст з пажаданымі падарункамі (вядома, у ледзяной скрыні).

У цырымоніі адкрыцця сталічнага «полюса холаду» ўзялі ўдзел і тыя, каму да маразоў і замкнёнай прасторы не прывыкаць: беларускія палярнікі Юрый ГІГІНЯК і Уладзіслаў МЯМІН расказалі наведнікам пра свае прыгоды і штодзённае жыццё ў Антарктыдзе. Разам з палярнікамі прысутныя запісалі зварот да сваіх калег, якія цяпер накіроўваюцца на паўднёвы кантынент і на працягу наступных месяцаў будуць манціраваць там першую беларускую антарктычную станцыю. Прывітанне з радзімы каманда ўбачыць, як толькі вернецца на вялікую зямлю ў афрыканскім Кейптаўне.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.
lyskavets@zviazda.by

■ Погляд

НАКОЛЬКІ «ІСЛАМСКАЯ ДЗЯРЖАВА» — ІСЛАМСКАЯ?

Фота з сайта tut.by

Сёння групоўка «Ісламская дзяржава Ірака і Ляванта», якая ў Расіі афіцыйна прызнана тэрарыстычнай, часта асацыюецца менавіта з мусульманамі і іх веравызнаннем. Але наколькі такое ўспрыманне слушнае? Зараз замежныя СМІ і кіраўнікі краін (напрыклад, прэзідэнт Францыі Франсуа Аланд) выкарыстоўваюць не агульнапрынятую абрэвіятуру «ІДІЛ», а яе арабскі адпаведнік «ДАІШ» — «Даўлат Ісламі Ірак ва-Шам». Такой жа пазіцыі ў апошнія тыдні сталі паступова прытрымлівацца і некаторыя СМІ нашай усходняй суседкі. Да выкарыстання аналага заклікае і кіраўнік Савета муфтыяў Расіі шэйх Равіль Гайнутдзін. Бо для членаў групоўкі такая назва абразлівая. Яна сугучная з арабскімі словамі «daes» («той, які тупае/ душыць нагамі») і «dahes» («той, хто сее разлад/разбурэнне»). У размове з Рустамам ХАСЯНЕВІЧАМ, усходазнаўцам, дырэктарам Беларускага цэнтра стандартызацыі і сертыфікацыі «Халяль», пра тое, наколькі ідэі групоўкі адпавядаюць каштоўнасцям ісламу, мы выкарыстоўвалі менавіта яе.

— На вашу думку, наколькі ДАІШ небяспечная для Беларусі?

— Прамой пагрозы ў гэтым плане для краіны няма. У Беларусі адсутнічае тэндэнцыя развіцця ідэалогіі групоўкі. Таму што мусульман пражывае не так шмат (некалькі дзясяткаў тысяч), і ў муфтыята атрымліваецца аб'ядноўваць усіх вернікаў пад агульным дахам мячэці.

— А чаму ў астатніх краінах, асабліва ў Еўропе, ДАІШ мае столькі прыхільнікаў?

— ДАІШ развіваецца з-за таго, што людзі не маюць належнай рэлігійнай адукацыі. Групоўка займаецца прапагандай радыкальнага ісламу і не тлумачыць сутнасць рэлігіі цалкам, а толькі тыя факты, якія ім на руку. Бяруць цытату з Карана і трактуюць, як лічаць патрэбным. Таму ў рады групоўкі трапляюць тыя, хто не ведае і не разумее ісламу. А іх сёння ў свеце нямала.

— Наколькі я ведаю, гэта ўвогуле далёкая ад ідэалаў ісламу арганізацыя.

— Безумоўна. Яны парушаюць асноўныя прынцыпы нашай веры. Само слова «іслам» паходзіць ад слова «салам» — гэта значыць мір. Падкрэслю: гэта рэлігія, якая павінна несці ў сабе мір. І слова мусульманін ад арабскага слова «аслама» — уверавшы ў адзінага Бога.

Мэта ісламу, ды, напэўна, і астатніх рэлігій, — акрэсліць людзям мяжу паміж дабром і злом. Сёння яна вельмі тонкая. Яе лёгка пераступаюць, займаюцца самаапраўданнем. Па логіцы людзей, яны робяць штосьці добрае, але насамрэч гэта шкодзіць іх асяроддзю і грамадству ў цэлым.

У свой час я вывучаў нашу рэлігію вельмі шырока, прачытаў усе даступныя кнігі, і адукацыя ў мяне адпаведная. За гады вывучэння не адшукаў у ёй ніякай агрэсіі, прыхаванай варожасці ні з мусульманамі, так і з іншымі вернікамі. Прарок Мухамед жыў у міры і спакоі разам з іўдзеямі, хрысціянамі, няверуючымі. Ён паказаў нам прыклад таго, што не толькі можна, але і неабходна несці мір не толькі мусульманам, а таксама і тым, хто вызнае іншыя веры і нават і тым, хто ў Бога не верыць. Як казаў Прарок, «ад мусульманіна не павінна быць шкоды: ні ад яго рукі, ні ад яго языка». А ДАІШ парушыў усе гэтыя прынцыпы: яны ваююць, забіваюць безабаронных людзей, нават мусульман, што з'яўляецца адным з самых вялікіх грахоў.

— Можаце правесці гістарычную паралель з ДАІШ?

— Такая ж сітуацыя ў свой час была на Паўночным Каўказе. Калі расійскі ўрад разабраўся, чым адрозніваюцца мусульмане ад тэрарыстаў, тады змог сілавым спосабам супакоіць вайну, і цяпер Расія кантралюе Паўночны Каўказ. Расіяне паказалі, што паважаюць мусульман, іх рэлігію і традыцыі, яны сочаць за адукацыяй, ідэалогіяй, якая там сеецца. Тым самым змаглі пазбавіцца ад экстрэмістаў, якія прапагандавалі радыкалізм. Таму адказнасць шмат у чым кладзецца на плечы дзяржавы: яна мусіць сачыць за тым, хто і як навучае ісламу, якія прапаведнікі прыязджаюць на яе зямлю.

— А былі выпадкі, калі ў Беларусь прыязджалі такога кшталту «прапаведнікі»?

— Так, былі. Яны спрабавалі тут застацца і дзейнічаць. Але мусульманская супольнасць іх выцесніла. Мы паказалі, што маем сваю сістэму навучання ісламу для ўсіх ахвотных. Так бы мовіць, адсеклі ўсе іх спробы на пачатку.

Таксама важна, што мы маем паразуменне з беларускімі дзяржаўнымі органамі. Яны супрацоўнічаюць з муфтыятам і бачаць, што мусульманская супольнасць вызнае традыцыйны ісламмірную рэлігію. Мусульмане ў Беларусі жывуць ужо 600 гадоў (іслампринеслі ў свой час татары). Ні разу за гэты час у нас не было сутыкненняў на рэлігійнай глебе. Спадзяюся, што тое адмоўнае, што адбываецца ў свеце, так і не дакранецца Беларусі.

— Што ўвогуле можа прывабіць людзей у ДАІШ?

— У яе ўступаюць не надта паспяховыя асобы. Як паказваюць навуковыя даследаванні, у групоўку ідуць тыя, хто не рэалізаваўся ў сябе дома. Калі мусульманін пісьменны, любіць вучыцца, працаваць, ён добра прыстасуецца жыць і ў немусульманскай краіне. Тых, хто не адшукаў сабе месца на радзіме ці ў іншай краіне, ДАІШ прывабліваелозунгамі: «Прыходзьце сюды, мы ствараем новую дзяржаву, і вы будзеце каля яе вытокаў». З'яўляецца ілюзія, што людзі паедуць на заваяваныя тэрыторыі, зоймуць нішу ў навастворанымграмадстве. Здаецца, што грамадства, у якім цяперашнія ДАІШаўцы былі раней, іх не прымала, але насамрэч наадварот, — яны не прымалі яго. Развязаць вайну нескладана. Цяжка яе скончыць. Як правіла, прыхільнікі ДАІШ здольныя бурыць і знішчаць, а не будаваць.

— ДАІШ не першая ў гісторыі тэрарыстычная групоўка. Часцей за ўсё такія аб'яднанні хутка з'яўляюцца і хутка знікаюць. Як вы лічыце, што можа звесці ДАІШ на нішто?

— Каб адказаць на гэтае пытанне, трэба зазірнуць у гісторыю. Захад у XIX-XX стагоддзях трымаў мусульманскі свет пад калоніямі. Вялася жорсткая вайна супраць тых, хто вызнаваў ісламЗараз інтэрнэт поўніцца жудасных здымкамі той эпохі. Для француза было гонарам адсячы мусульманіну галаву і сфатаграфавацца з ёй. Мы шмат чаго не ведаем пра той час. Пра тое, што вайна ў Іраку вынішчыла значна больш людзей, чым мы думаем, у тым ліку і ні ў чым не павіннага мірнага насельніцтва. У Лівіі ў часы, калі Італія каланізавала яе, было забіта надзвычай шмат ісламскіх вернікаў. Гэта крыўда, злосць, агрэсія збіралася ў мусульманскім свеце. І калі ДАІШ займаецца прапагандай, яна кажа: зірніце, што Захад робіць з мусульманамі. Нам трэба стаць мацнымі і адпомсціць ім. Таму палітыка каланізацыі сыграла важную ролю ў фарміраванні сучасных тэрарыстычных груповак.

Трэба разумець, што тыя, хто быў на вайне, страціў там сваіх блізкіх, пабачыў смерць уласных дзяцей, сталі яе «дзецьмі». У іх наступае псіхалагічны пералом, калі нават не хочацца жыць, а толькі застаецца адно жаданне — адпомсціць злачынцу-Захаду. Такія людзі выступаюць перш за ўсё супраць палітыкі, якую той праводзіў.

Выйсце тут адно — змяніць сваё стаўленне да ісламу, пачаць яго паважаць. Гэта значыць, паважліва ставіцца і да яго вернікаў. Бо для мусульман вера адыгрывае адну з галоўных роляў у жыцці, яна — аснова традыцый, культуры нашых народаў. Калі не будзе прыгнёту, не будзе і групоўкі, якая базуецца на крыўдзе за гвалт. Бо можна бясконца фізічна знішчаць самых агрэсіўных ДАІШаўцаў, але трэба разумець, што крыўда ў сэрцах людзей ад гэтага не зменшыцца.

Вераніка ПУСТАВІТ.
pustavit@zviazda.by

■

Пра тое, наколькі тэрарыстычныя арганізацыі можна параўнаць з сектамі, у сваім артыкуле «Сектанцтва і тэрарызм» разважае Уладзімір МАРЦІНОВІЧ, беларускі сектазнаўца, загадчык кафедры апалагетыкі Мінскай духоўнай акадэміі (Беларуская Праваслаўная Царква), кіраўнік Інфармацыйна-кансультатыўнага місіянерскага цэнтра імя прападобнага Іосіфа, ігумена Волацкага. Ён прыводзіць даследаванне амерыканскага навукоўца Энтані Стахельскі, які вылучае пяць этапаў сацыяльна-псіхалагічнага ўздзеяння на чалавека, якое выкарыстоўваецца і ў сектах і культах, і пры падрыхтоўцы тэрарыстаў, у тым ліку тэрарыстаў-смяротнікаў:

— Спачатку на чалавека ўздзейнічаюць такім чынам, што страчваюцца ўсе яго мінулыя знешнія ідэнтычнасці. Ён ізалюецца ад свету ў лагеры — замкнёным соцыуме. З гэтага часу «ўвесь комплекс уяўленняў аб самім сабе звязваецца толькі з прыналежнасцю да новай групы».

Затым знішчаецца ідэнтычнасць самога чалавека. Разбураюцца мінулыя светапогляд, звычкі, каштоўнасці. Усе яны цяпер сугучныя з групавымі.

Трэці этап — фарміраванне думкі аб тых, хто да групы не належыць. Яны зліваюцца ў адзіную варожую масу. Адбываецца звужэнне знешняга свету да катэгорый «не мы», «іншыя». Адначасова павялічваецца агрэсія ў дачыненні да навакольнага свету, і псіхалагічны бар'ер, што іншага чалавека забіць нельга, паступова сціраецца.

Далей чацвёрты этап — усе, хто не належыць да групы, пачынаюць асацыявацца з нечалавечымі рысамі і істотамі: вірусамі, пацукамі, прусакамі. Якраз гэта і адрозніваетэрарыстычную групоўку ад сектаў і культаў. Апошнія ў большасці выпадкаў не дэгуманізуюць прадстаўнікоў знешняга свету.

Пяты, апошні этап — ідэнтыфікацыя членаў знешняга свету з абсалютным злом. Забойства іншавернага ці прадстаўніка «не сваіх» уяўляецца ганаровай місіяй, узнагароджваецца павагай з боку членаў сваёй групы. Гэта прадухіляе з'яўленне пасля здзяйснення забойства згрызот сумлення і шкадаванняў аб зробленым.

АДВАРОТНЫ БОК НАВАГОДНІХ «СПЕЦЭФЕКТАЎ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

А я задумаўся. Калі б не існавала попыту на неліцэнзійную піратэхніку, то знікла б і прапанова. Здавалася б, і часы гандлёвага дэфіцыту даўно адышлі ў мінулае. Чаму ж дагэтуль жыве правіла ў народнай свядомасці «нічога я шукаць не стану, таму што з рук усё дастану»?

— Калегі з МУС расказвалі, што нават эканамічнага эфекту ад набыцця неліцэнзаванай піратэхнікі няма. Кошт яе ў параўнанні з сертыфікаванымі таварамі, якія зроблены, захоўваюцца і рэалізуюцца па ўсіх правілах бяспекі, практычна аднолькавы. Часта на рэйдах мы бачым шмат змятых вільготных упаковак з ёй. Гэта значыць, што яна магла захоўвацца абы-дзе — напрыклад, на складзе, які не ацяпляецца, у гаражы, на прыватным падворку... Пры гэтым для большасці піратэхнічных вырабаў умовы захоўвання вызначаны жорстка — ад плюс 10 да плюс 25 градусаў пры дастаткова сухім паветры. Гэта значыць, што нават сертыфікаваныя тавары нельга пакідаць на балконе ці ў кватэры з павышанай вільготнасцю.

«Шэрая» піратэхніка не прайшла выпрабаванняў у сертыфікаванай лабараторыі на тэрыторыі ЕАЭС. А гэта значыць, што, хутчэй за ўсё, да ўпакоўкі петардаў, набытых з-пад палы, не знойдзецца інструкцыі. Зрэшты, запаветная паперка можа і адшукацца, аднак яна будзе надрукавана па-кітайску. Вось і ўжываецца метад навуковага «тыку». Толькі эксперыменты з піратэхнікай рызыкуюць скончыцца вельмі дрэнна. Штогод медыкі рэгіструюць дзясяткі траўмаў твару, рук, вачэй, выкліканых няправільным выкарыстаннем святочнай піратэхнікі.

РУЛЕТКА СА СМЕРЦЮ

Запускаць петарды мусіць выключна цвярозы чалавек, чыя рэакцыя не будзе затуманена алкаголем. Рабіць гэта рэкамендуюць не менш як за 30 метраў ад будынкаў — можа здарыцца так, што забаўка паляціць не туды і хтосьці атрымае палаючую рэч у якасці непажаданага «падарунка» сабе ў кватэру. У кварталах савецкай забудовы такую пляцоўку адшукаць даволі лёгка, а вось у сучасных ушчыльненых мікрараёнах з гэтым ужо будзе цяжэй. Ды і зважаць трэба не толькі на пажарную бяспеку. Калі нават вы выканалі ўсе патрабаванні па адлегласці ад жылых дамоў, а петарду запускаеце ва ўмовах шчыльнай забудовы, то на вас могуць паскардзіцца ў міліцыю суседзі на тое, што парушаеце грамадскі парадак. Асабліва гэта датычыцца так званых дваро-«калодзежаў», у якіх акустыка вельмі добрая. А вось у жылых памяшканнях забаўляцца з піратэхнікай катэгарычна забаронена.

Але здараецца і так, што петарду па ўсіх правілах запусцілі, а яна ўпала на зямлю ці ў снег, пашыпела крыху і заціхла. Такі бракаваны піратэхнічны снарад забраў на пачатку года жыццё 18-гадовага юнака ў сталіцы. Пасля таго, як петарда не спрацавала, малады чалавек падышоў і нахіліўся над ёй. І якраз у гэтую секунду прагрымеў выбух. Снарад прабіў юнаку галаву. Яго хутка даставілі ў бальніцу са шматлікімі пашкоджаннямі галаўнога мозга, касцей носа ды чэрапа і апёкамі твару. Адразу ж небараку павезлі на аперацыйны стол. Працягнуўшы яшчэ некалькі дзён у рэанімацыйным аддзяленні Мінскай гарадской бальніцы хуткай дапамогі, юнак памёр...

— Калі петарда не спрацавала, падыходзіць да яе нельга бліжэй за дваццаць метраў. А прыкладна праз гадзіну асцярожна заліце яе вадой. Для вялікай батарэі ці так званага «торта», якія сталі вельмі папулярнымі ў апошнія гады, правілы крыху іншыя, таму лепш загадзя прачытаць інструкцыю. Між іншым, бяды можа нарабіць і піратэхніка, у якой скончыўся тэрмін выкарыстання. Проста выкінуць яе нельга — невядома, хто падбярэ такі снарад?

Набываць «пра запас» піратэхніку таксама не варта. Як і любы тавар, яна мае свой тэрмін прыдатнасці. І калі ён скончыўся, то адзінае, што застаецца зрабіць — утылізаваць. А як гэта зрабіць бяспечна, зноў жа напісана ў канкрэтнай інструкцыі. Для розных тыпаў забавак розныя і спосабы.

Даволі часта можна пабачыць у дварах, як запускаць піратэхніку выходзяць цэлымі сем'ямі. Малым, безумоўна, цікава паглядзець на тое, як у небе расцвітаюць яркія агеньчыкі. Але ж і адказнасць бацькоў за здароўе сваіх дзяцей узрастае шматкроць. Той максімум, які ім можна даверыць, — гэта бенгальскі агонь, і тое трымаць яго яны мусяць пад пільным кантролем дарослых, якія здолеюць своечасова адрэагаваць, калі іскра трапіць не туды. Сучасная кватэрна літаральна нашпігавана разнастайнай сінтэтыкай, якая загараецца за долі секунды і вылучае шмат ядавітых газаў. Да таго ж і яркая святочная вопратка таксама нярэдка зроблена са штучных тканін... Не гуляйце ў «рулетку»!

Валяр'ян ШКЛЕННІК
schklennik@zviazda.by

■ На слыху

ВЫПАДКОВА ПАДСТРЭЛІЎ ЗУБРА

У буйную суму абышлася памылка замежнаму турысту з Балгарыі. Падчас паляўнічага тура па белавежскіх угоддзях ён падстрэліў зубра.

— Як высветлілася, выпадкова: пераблытаў яго з дзіком. Зубр ішоў адзін, што не зусім характэрна для гэтага віду, — паведаміла **прэс-сакратар Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Вольга ГРАМОВІЧ.** — Згодна з папярэдняй ацэнкай, самец быў фізічна знясіленым, верагодна, з гэтай прычыны адбіўся ад статка.

У той жа дзень балгарын, які цалкам прызнаў сваю віну, пакрыў нанесеную шкоду — 216 мільёнаў рублёў. Апроч таго, пералічыў паляўнічай гаспадарцы 40 тысяч еўра ў лік частковай аплаты пяцікратнага кошту дазволу на здабычу жывёлы. Яшчэ 52 тысячы еўра паляўнічы абавязаўся выплаціць на працягу месяца.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

САБАКІ ЗАГРЫЗЛІ ДА СМЕРЦІ

Ля вёскі Цагельня ў Гомельскім раёне раніцай на лясной дарозе паміж могілкамі і свінакомплексам знайшлі цела мясцовага жыхара.

Як расказала **афіцыйная прадстаўніца Гомельскага абласнога ўпраўлення Следчага камітэта Марыя КРЫВАНОГАВА**, паводле вынікаў судова-медыцынскай экспертызы, смерць мужчыны 1951 года нараджэння наступіла ад значнай страты крыві ў выніку пашкоджанняў буйных крывяносных сасудаў:

— Пры аглядзе на целе мужчыны было знойдзена многа слядоў ад укусаў жывёл, падобных на сабачыя. Падчас праверкі ўстаноўлена, што мясцовы жыхар заступіў на сутачнае дзяжурства на асфальтабетонны завод, дзе працаваў вартаўніком. Але ж вечарам, па словах відавочцаў, мужчына распіваў спіртныя напоі каля крамы, а потым зноў накіраваўся на працу. Па дарозе і адбылася трагедыя.

Да адлову безнаглядных жывёл падключыліся супрацоўнікі прадпрыемства «Спецкамунтранс» з абласнога цэнтра, Гомельскага лясгаса, а таксама прадстаўнікі таварыства паляўнічых і рыбаловаў.

Ірына АСТАШКЕВІЧ. *iost@zviazda.by*

Мясцовае самакіраванне

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

9 снежня 2015 г.
№ 23 (363)

ЖЫВАЯ ЗЯМЛЯ

ВЯРТАННЕ «ДАЎГОЎ»

Ці будуць «лёгкія Еўропы» дыхаць на поўную моц?

Леанід ЛАХМАНЕНКА

Мясцовыя ўлады падтрымліваюць гэты праект, бо разумеюць: заказнік Ельня — гэта жамчужына не толькі Мёрскага раёна, але і беларускай прыроды, і яе неабходна захаваць для будучых пакаленняў. Аднаўленне гідралагічнага балансу Ельні дазволіць балоту зноў стаць важкай крыніцай даходаў для мясцовага насельніцтва.

Некалі тут было адно з найбуйнейшых у Еўропе месцаў вырастання журавін. Будучыя магчымыя аб'ёмы ўраджаю гэтай карыснай ягады навукоўцы ацэньваюць у некалькі мільёнаў долараў ЗША штогод.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Вяртанне балота ў былы стан таксама дазволіць прадухіліць утварэнне сухіх пажаранебяспечных участкаў і пустак, знізіць верагоднасць узнікнення маштабных тарфяных пажараў. «Дастаткова нагадаць, што ў нядаўнім мінулым пажары мелі катастрофічныя наступствы для прыродных экасістэм заказніка. У свой час полымя знішчыла палову тэрыторыі, цяжкія страты панесла яго біяразнастайнасць», — гаворыць **начальнік раённай інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Іван РУНДА.**

Праект па адраджэнні Ельні, пра які ідзе гаворка, сапраўды ўражвае. Ён распрацаваны сумесна з Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя і Праграмай развіцця ААН пры актыўным удзеле мясцовай улады. Яе зацікаўленасць зразумелая: праект дапаможа вярнуць Ельню да натуральнага стану, зноў набыць вядомасць у якасці ўнікальнага прыродна-ландшафтнага комплексу, дзе жывуць рэдкія «чырванакніжныя» віды птушак і жывёл. На тэрыторыі балота налічваецца 98 відаў птушак, 23 з якіх занесены ў Чырвоную кнігу. Аднаўленне Ельні дасць магчымасць жыхарам навакольных вёсак зарабляць на зборы журавін. Нагадаем, Ельня — адно з самых буйных верхавых балот у кантынентальнай Еўропе. Яго плошча складае больш за 23 тысячы га. Па запасах вады, нават без уліку шматлікіх азёр, Ельня багацейшая за Вілейскую водную сістэму. Нездарма заказніку прысвоены міжнародны статус Рамсарскага ўгоддзя.

Але рэалізацыя такога маштабнага праекта патрабуе ўкладання вялікіх сродкаў, якіх, зразумела, не хапае ў мясцовым бюджэце. Таму ў ролі інвестара выступае Праграма развіцця ААН і яе замежныя партнёры, зацікаўленыя ў адраджэнні балот, за якімі замацавалася рэпутацыя «лёгкіх Еўропы».

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

Сем'і — удзельнікі праекта «Узаемадзеянне для квітнення». Урачыстая перадача саджанцаў маліны.

І САБЕ, І ЛЮДЗЯМ

«МАЛІНАВАЯ» ІДЭЯ ПРЫЖЫЛАСЯ НА БРАГІНШЧЫНЕ

Жыхарам раёна даводзіцца пераадольваць наступствы міфаў пра радыяцыю

Ірына АСТАШКЕВІЧ

Новую праваслаўную царкву ў вёсцы Мікульчы Брагінскага раёна адкрылі ў мінулым месяцы. Для гэтай мэты, параіўшыся, цалкам перарабілі будынак былога сельвыканкама. Мясцовыя жыхары, аб'яднаныя сямейным клубам пад назвай «Мікуляначка», сабраліся разам, каб аднавіць храм у вёсцы з сумнай чарнобыльскай спадчынай. Калісьці, у канцы 80-х, гэтая вёска падпадала пад абавязковае адсяленне. Хтосьці адсюль з'ехаў, хтосьці застаўся. Хтосьці пажыў у чужых краях, але вярнуўся на малую радзіму.

Сёння ў вёсцы жыве шмат маладых сем'яў, якія таксама прыйшлі на адкрыццё сельскага храма. А члены сямейнага клуба «Мікуляначка» арганізавалі выставу розных вырабаў, грошы ад продажу якіх пайшлі на далейшае добраўпарадкаванне царквы. Канцэрт народнага калектыву «Весялуха» дабавіў святу радасных фарбаў.

Гэта — толькі адна з ініцыятыў, увасобленых у рамках праекта «Развіццё патэнцыялу сеткі сямейных клубаў у чарнобыльскай зоне з мэтай паляпшэння сацыяльна-эканамічнай сітуацыі». Яго партнёрам з'яўляецца грамадская арганізацыя «Беларускі зялёны крыж» пры падтрымцы Еўракамісіі. Пад яе эгідай у Брагінскім раёне створана шэсць сямейных клубаў, у якія ўвайшлі людзі, звязаныя паміж сабой пэўнымі інтарэсамі.

Жанна Чубса з 2011 года кіруе філіялам міжнароднага фонда «Развіццё сельскіх тэрыторый». Яна сама рыхтуе праекты для атрымання мікрафінансавання ад розных замежных арганізацый і праводзіць шматлікія семінары, якія дапамагаюць іншым увасабляць свае ідэі ў жыццё. Між тым іх у жыхароў Брагіншчыны, якія жывуць на тэрыторыі, дзе ўвогуле няма прамысловых прадпрыемстваў, зашмат. «Напрыклад, ужо рэалізаваны ў раёне праект пад назвай «Наша доўгая кароўка». Спачатку для шасці шматдзетных сем'яў вёскі Сялец у рамках грантаў «Зялёнага Крыжа» былі набыты каровы. Па заключаным дагаворы людзі бясплатна перадавалі два цяляці ад сваёй жывёлы іншай сям'і, якая таксама хацела развіваць гаспадарку ў «малочным» кірунку. Урэшце за 3,5 года пагалоўе буйной рагатай жывёлы ў прыватным сектары Сяльца павялічылася з 17 да 70», — адзначае Жанна Чубса.

> Мы хочам, каб нам давяралі, бо Брагінскаму раёну дагэтуль даводзіцца пераадольваць наступствы чутак і плётак пра радыяцыю.

— Калі пачаў дзейнічаць праект ПРААН «Павышэнне ўзроўню бяспекі чалавека на тэрыторыях, пацярпелых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС», быў напісаны працяг праграмы «Наша доўгая кароўка». Для людзей закупілі яшчэ шэсць кароў і больш сучаснае абсталяванне, якое дазволіла па выгадным кошце здаваць малако на хойніцкае прадпрыемства «Палескія сыры». Такім чынам у вёсцы Сялец быў адкрыты пункт прыёму малака і заключаны дагавор з малаказаводам.

Жанна ЧУБСА з мясцовымі жыхарамі абмяркоўвае іх ініцыятывы.

Узначаліла кааператыў «Сялецкі аграрый» Таццяна Рак. Яна сама трымае аж два дзясяткі каровак і кіруе пунктам прыёму малака ў мясцовага насельніцтва. Многія сем'і зараз абзавяліся 4-5 жывёламі, і гэта стала ў каго асноўным, у каго дадатковым заняткам.

Прадбачу прадказальнае пытанне — наконт радыяцыі. Між тым за папярэднія 30 гадоў тут, у чарнобыльскай зоне, было ўвасоблена шмат праектаў і праграм, якія навучалі жыхароў раёна жыць на гэтых тэрыторыях. Жыць і перасцерагацца, жыць і кантраляваць, але — жыць. І не баяцца.

— Кожны раз наша малако праходзіць радыяцыйны кантроль. І нарматывы па радыяцыі ніколі не перавышаюцца. Бо ўсе мы ўжо добра ведаем, дзе і як нарыхтоўваць кармы, як іх правяраць і як увогуле сябе засцерагчы. Мы проста навучыліся жыць у гэтай сітуацыі, — адзначае Жанна Чубса.

Муж і жонка Аляксандр і Жанна Чубсы не толькі словам, але і справай прыклад іншым паказваюць. У сям'і ёсць участак зямлі, дзе 7 сотак — пад малінай і столькі ж — пад суніцамі.

— Наш бізнес-план быў зацверджаны і падтрыманы ў рамках праекта ПРААН «Павышэнне ўзроўню бяспекі чалавека на тэрыторыях, пацярпелых ад катастрофы на ЧАЭС». Спецыялісты памералі ўзровень радыяцыі на прысядзібным участку і бясплатна далі для высадкі садовую маліну.

«Малінавая» ідэя пайшла па Брагіншчыне пераможным маршам, і цяпер у раёне ёсць два гадавальнікі. Іх гаспадары падтрымліваюць малазабяспечаныя і шматдзетныя сем'і, якім зусім нядаўна, па восені, былі раздадзены саджанцы салодкай ягады, якую тут вырошчваюць таксама пад пільным радыяцыйным кантролем і без ужывання хімікатаў.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

ТЭМА ДНЯ

ЁСЦЬ ПРАЦА — БУДЗЕ І НАСТРОЙ

Занятасць насельніцтва — галоўнае пытанне для дэпутатаў

Час уносіць карэктывы ў эканамічнае і сацыяльнае жыццё краіны. Бываюць узлёты, бываюць і часовыя цяжкасці. У залежнасці ад абставін мяняюцца і формы работы дэпутатаў мясцовых Саветаў. Менавіта яны, як ніхто іншы, валодаюць сітуацыяй у сваім населеным пункце, ведаюць аб праблемах і клопатах сваіх жыхароў.

Фота Надзеі БУЖАН.

— У краіне наладжана дакладная і разгалінаваная сістэма работы органаў мясцовага самакіравання. Сёння разам з актывам, дэпутацкім корпусам трэба захаваць напрацаванае, прааналізаваць вынікі сваёй работы і падумаць на перспектыву — як вырашаць пытанні, што хвалююць людзей на месцах, — звярнулася да старшынь пасялковых і сельскіх Саветаў дэпутатаў **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Святлана ГЕРАСІМОВІЧ**.

Што да сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёнаў, то яны адрозніваюцца ў залежнасці ад многіх фактараў, у тым ліку чалавечага, арганізацыйнага, кадравага, дэмаграфічнага. «Але самае галоўнае пытанне, якому павінны надаваць увагу дэпутаты, — працоўная занятасць насельніцтва, — падкрэсліла Святлана Герасімовіч. — З гэтага пачынаецца ўсё астатняе: і дабрабыт сям'і, і настрой людзей».

Дэкрэт Прэзідэнта №6 дае магчымасць развіваць малое прадпрымальніцтва, прыватны бізнес і па першым часе не плаціць падаткі з прыбытку. Але на месцах не ўсюды скарысталіся дадзеным правам. «Вынік, бясспрэчна, ёсць. Але не такі, як хацелася б», — удакладніла сенатар. Цяпер у дакумент уносяцца дапаўненні, якія прадаставяць дадатковыя магчымасці для ахвотных рэалізаваць сябе ў бізнесе.

— Экспарт, прыцягненне інвестыцый у свой рэгіён — гэтыя пытанні таксама трэба разглядаць на сесіях сельскіх і пасялковых Саветаў, — упэўнена Святлана Герасімовіч. А ў гэтым, бясспрэчна, дапамогуць планы сацыяльна-эканамічнага развіцця населеных пунктаў, сельсаветаў. Напрыклад, у свой час у Мінскай вобласці такая праграма дзеяння не толькі карпатліва распрацоўвалася, але і змяшчалася на інфармацыйных стэндах сельскіх Саветаў. Прычым з указаннем адказных за той ці іншы напрамак (у асобе кіраўнікоў дзяржаўных і прыватных прадпрыемстваў), а таксама — тэрмінаў рэалізацыі.

Святлана Герасімовіч параіла распрацаваць план сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2016 год у кожным сельскім Савеце. І ў абавязковым парадку абмеркаваць яго з актывам, старэйшынямі, кіраўнікамі, прааналізаваць, што будзе зроблена па кожнай вёсцы, у тым ліку і неперспектыўных.

Старшыні пасялковых і сельскіх Саветаў будуць уключаны ў маніторынгавыя групы, што створаны пры раённых і гарадскіх Саветах дэпутатаў. Яны выязджаюць на прадпрыемствы, у сельгасарганізацыі, туды, дзе ёсць праблемы з выплатай заработнай платы, занятасцю і іншыя.

— Трэба не толькі вывучаць сітуацыю, але і глядзець, чым можа дапамагчы дэпутацкі корпус, уносіць прапановы па выпраўленні становішча, разглядаць пытанні на пасяджэннях прэзідыума абласнога, раённага і нават сельскага Саветаў. Вядома, не ўсё вырашаецца на месцы. Па выніках аналізу будуць зроблены прапановы мясцовай і рэспубліканскай уладам, — адзначыла сенатар.

У краіне дзейнічаюць 327 дэпутацкіх груп. Пад іх увагай найперш — праблемныя суб'екты гаспадарання. Гэтыя групы адкрылі грамадскія прыёмныя, куды можа звярнуцца любы грамадзянін. Магчыма, не ўсе пойдуць са сваімі пытаннямі да кіраўніка завода, але да дэпутата людзі не баяцца звярнуцца з жыццёвымі клопатамі. Пры станоўчым вырашэнні ў чалавека паляпшаецца настрой, а значыць, і праца ідзе спарней.

— Мне б хацелася, каб вы ў гэтых аб'яднаннях не стаялі ўбаку, а глядзелі, дзе можна падставіць плячо людзям у такі нялёгкі час, — сказала Святлана Герасімовіч.

Звярнула яна ўвагу і на развіццё і падтрымку аграгарадкоў, дзе сканцэнтравана асноўная інфраструктура. З гэтай нагоды Святлана Герасімовіч прывяла прыклад нашай суседкі — Расіі. У невялікіх населеных пунктах, якія маюць багатую самабытную гісторыю, здолелі прыцягнуць прыватныя інвестыцыі. Напрыклад, сімвалам невялікага гарадка Мышкаў, што на рацэ Волга, стала мышаня. І, вобразна кажучы, гэта надало прывабнасці паселішчу — за год тут пабывала 100 тысяч турыстаў. У нашых населеных пунктаў свая цікавая і адметная гісторыя, свае асаблівасці, якія варта выкарыстаць для прыцягнення турыстаў.

Раней пры сельскіх Саветах працавалі інфармацыйна-прапагандысцкія групы.

— Бясспрэчна, не трэба іх аднаўляць фармальна, штучна, не варта гнацца за колькасцю ўдзельнікаў. Магчыма, гэта будуць 3 чалавекі, але ж такія, якія валодаюць ведамі, аб'ектыўнымі звесткамі, людзі дзяржаўнага складу, якія могуць данесці да грамадзян аргументаваную інфармацыю, — падкрэсліла сенатар.

Так, дэпутаты шмат робяць на сваіх тэрыторыях, але часта пра гэта не ведаюць жыхары.

— Трэба смялей інфармаваць людзей пра зробленае, пра тое, што намячаеце зрабіць, на старонках рэгіянальных газет, агучваць па мясцовым радыё, — падсумавала Святлана Герасімовіч.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.
lazovskaya@zviazda.by

ЗВЯЗАНЫЯ КАРАНЯМІ

«СЯМЕЙНЫЯ ХРОНІКІ» І ІНШЫЯ ЦІКАВОСТКІ

Дэпутацкія справы натхнілі старшыню Васькавіцкага сельсавета Слаўгарадскага раёна Аляксандру Плехаву на стварэнне радаводу

Нэлі ЗІГУЛЯ

Гэта цяпер яна Плехава, а да таго, як выйшла замуж, была Кузьміна. Вельмі тыповае прозвішча для Папоўкі, дзе сама жыве. А яшчэ ў яе родзе былі Цвярдоўскія, Вашчылы, Гапоненкі... Сямей з такімі прозвішчамі ў Васькавіцкім сельсавеце колькі заўгодна. Цікава ж даведацца, сваякі яны табе або проста цёзкі?

«Род сыходзіць, і род прыходзіць...»

— Пры сустрэчах, размовах з людзьмі нечакана даведваешся штосьці пра сваіх родных, штосьці пра чужых, — усміхаецца Аляксандра Плехава. — Пачынаеш шукаць інфармацыю — і робіш сапраўдныя адкрыцці. На жаль, старых людзей становіцца ўсё менш, і пачуць нешта новае складана. Цяжкае ў іх было жыццё, але ж цікавае.

Аляксандра ПЛЕХАВА са сваёй цёткай Таццянай.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

УСЁ Ў ПАРАДКУ

ЗА ЧЫСТЫ МОТАЛЬ!

Святлана ЯСКЕВІЧ

У Мотальскі сельсавет, што ў Іванаўскім раёне, уваходзяць толькі два населеныя пункты, затое якія — аграгарадкі Тышкавічы і Моталь. Тут жыве больш за 5270 чалавек — амаль палова невялікага райцэнтра. Зразумела, што добраўпарадкаванне ў такіх вялікіх вёсках, належнае ўтрыманне інфраструктуры ды іншых аб'ектаў становіцца галоўнай задачай мясцовага органа ўлады.

Тым больш што Моталь — месца асаблівае. Тут праходзяць адметныя мерапрыемствы, працуюць аж тры музеі (народнай творчасці, археалагічны і дом, у якім нарадзіўся першы прэзідэнт Ізраіля Хаім Вейцман), у вёску прыязджае нямала гасцей і турыстаў. У аграгарадку і ваколіцах дзейнічае чатыры аграсядзібы. У самім Моталі ёсць гасцініца. Яе афіцыйная назва — гатэль «Фэст». І запатрабавана яна бывае не толькі летам або пры правядзенні вядомага кулінарнага фестывалю. Вось і зараз у гатэлі пражываюць італьянскія спецыялісты, якія прыехалі аказваць тэхнічную дапамогу аднаму з прадпрыемстваў Іванава. Тое, што замежныя госці спыніліся ў вясковым гатэлі, гаворыць, несумненна, пра яго ўзровень.

— Трымаць гэты ўзровень было б надзвычай складана, — гаворыць **старшыня Мотальскага сельскага Савета дэпутатаў Сяргей ПІЛІПОВІЧ**, — каб не дапамога шматлікіх прадпрымальнікаў і прадпрыемстваў, якія працуюць на тэрыторыі, і разуменне абсалютнай большасці насельніцтва.

Напрыклад, у 2015 годзе на добраўпарадкаванне сельсавета было выдзелена толькі 20 мільёнаў рублёў. За гэтыя грошы хіба толькі падкошваць газоны ды ўзбочыны, ну, яшчэ што-нішто з драбязы рамантаваць. Ажыццяўляць жа нейкія праекты па добраўпарадкаванні, вядома, не атрымалася б. А праект, які часткова рэалізавалі ў гэтым годзе, датычыць паляпшэння тэрыторыі вакол водных аб'ектаў. Іх падчысцілі, прыбралі, акультурылі берагі і месцы адпачынку. Гэта была ў многім дэпутацкая ініцыятыва — узяцца за прыбярэжную зону Ясельды. Рака, на беразе якой і ўзнік некалі Моталь, цяпер абмялела, мяняецца яе рэчышча. Ну і не спрыяе рэчцы смецце, якое рэгулярна пакідаюць адпачывальнікі... Дэпутат абласнога Савета Мікалай Шыкалай разам з дэпутатамі сельскага Савета ўзначалілі шэраг суботнікаў па ачыстцы і берагоў, і самой акваторыі ракі. Заадно былі знесены палі старога моста. Тым часам дэпутат раённага Савета Мікалай Стасевіч пры падтрымцы прадпрымальнікаў і прыватных прадпрыемстваў арганізаваў падсыпку прыбярэжнай часткі ў раёне вуліцы Набярэжнай. Там атрымалася невялікая пляцоўка, якую з часам можна будзе выкарыстаць. Заадно ачысцілі затоку і рэканструявалі пірс для пажарнага забору вады. На добраўпарадкаванне ракі пайшлі грошы не толькі прадпрымальнікаў і гаспадарак — пэўную суму сабралі жыхары прыбярэжных вуліц.

Старшыня сельскага Савета Сяргей ПІЛІПОВІЧ (справа) разам з падлеткамі садзіць дрэвы.

А дначасова праводзілі добраўпарадкаванне на двух азёрах, якія афіцыйна лічацца месцам для купання і адпачынку. Па берагах з'явіліся кантэйнеры для смецця, лаўкі для адпачынку. Фінансамі і тэхнікай дапамаглі абодва сельгаспрадпрыемствы — «Агра-Моталь» і «Тышкавічы-Агра». А яшчэ кіраўнік фермерскай гаспадаркі, дэпутат сельскага Савета Соф'я Новік дапамагла знесці аварыйнае дрэва, выдзеліла грошы на выраб лавак, якія потым паставілі ля возера Мульное.

— Столькі грошай і сіл было патрачана! — расказвае старшыня сельвыканкама.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

З КАРЭКЦІРОЎКАЙ НА ДАХОДЫ

Дэпутаты Магілёўскага абласавета зацвердзілі папраўкі ў бюджэт-2015

Гэта было звязана з прагнозам галоўнага фінансавага ўпраўлення аблвыканкама аб недапаступленні асноўных сродкаў у бюджэт. Ён быў зроблены па выніках аналізу 10 месяцаў гэтага года. Каб выдаткі не перавышалі даходы, спатрэбілася прыняць меры для збалансавання.

— Усе сацыяльныя напрамкі, я маю на ўвазе абароненыя артыкулы, засталіся амаль без змяненняў, — адзначыў **старшыня Магілёўскага аблсавета дэпутатаў Анатоль ІСАЧАНКА**. — Гэта датычыцца заробку, камунальных плацяжоў, сур'ёзных сацыяльных аб'ектаў. Карэкціроўцы падвергліся інвестпраграмы, крышачку давялося «падрэзаць» капрамонты, бягучыя рамонты. Зараз мы актыўна займаемся фарміраваннем бюджэту і прагнозаў на 2016 год. Кожны раён у прысутнасці структурных падраздзяленняў аблвыканкама і дэпутацкага корпуса агучвае, як плануе выконваць асноўныя паказчыкі ў наступным годзе. Галоўная наша задача — напаўненне бюджэтаў і скарачэнне датацыйнасці раёнаў.

Нэлі ЗІГУЛЯ. *zigulya@zviazda.by*

ВЯРТАННЕ «ДАЎГОЎ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Каб гэтыя «лёгкія» дыхалі, так бы мовіць, на поўную моц, у Ельні плануецца ўзвесці больш за 50 каскадных плацін і перамычак на водаадводных каналах. Бо летась спецыялісты, якія з дапамогай мясцовых жыхароў правялі абследаванне балотнага масіву, высветлілі, што існуючыя перамычкі перастаюць выконваць сваё функцыянальнае прызначэнне, а іх колькасць відавочна недастатковая.

Падчас будаўніцтва выкарыстоўваецца вопыт і прымяняюцца тэхналогіі, што паспяхова зарэкамендавалі сябе пры рэкрэацыі балот у Ірландыі і Паўночнай Шатландыі. Новыя збудаванні вельмі важныя для захавання азёрна-балотнага комплексу «Ельня». Каб вярнуць балота ў ранейшы стан, трэба забяспечыць раўнамерны пад'ём узроўню вады.

Ельня — жамчужына беларускай прыроды.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Заказнік таксама здольны стаць цэнтрам міжнароднага экалагічнага і навуковага турызму. Ельня — важная транзітная пляцоўка для пералётных птушак, яна валодае неацэнным матэрыялам для назіранняў навукоўцаў, практычных работ студэнтаў замежных ВНУ, арнітолагаў-аматараў. Славіцца Ельня і сваімі дзікарослымі лекавымі травамі: у навакольных вёсках захаваліся сотні арыгінальных напояў і настояў, якія могуць стаць брэндам рэгіёна.

Безумоўна, у Мёрскім раёне ўлічваецца досвед работ па вяртанні ў былы стан іншых беларускіх балот. Напрыклад, у Чэрвеньскім раёне, які можна лічыць паказальным у плане паўторнага забалочвання асушаных тарфянікаў. Да маштабнага асушэння ў сярэдзіне мінулага стагоддзя гэтыя тарфянікі ўяўлялі сабой досыць прывабную экасістэму з разнастайным прыродным ландшафтам. Аднак бяздумнае ўмяшанне стала прычынай пажараў, самы моцны з якіх знішчыў амаль 30% тэрыторыі. У атмасферу трапілі тысячы тон парніковых газаў.

Паўторнае забалочванне стымулявала натуральнае аднаўленне парушанай экасістэмы.

Але паставім пытанне гранічна прагматычна: што атрымалі мясцовыя жыхары ад рэнатуралізацыі, кажучы навуковай мовай, балот у Чэрвеньскім раёне?

Як ні дзіўна, у першую чаргу — свежае і чыстае паветра. Раней у спякотныя дні рэгулярна адбываліся ўзгаранні сухіх тарфянікаў. І тады жыхары навакольных вёсак і нават райцэнтра былі вымушаны дыхаць едкім дымам, багатым на ўтрыманне выкідаў небяспечнага дыяксіду вугляроду. Балотныя пажары былі частай з'явай, асабліва ў засушлівыя гады. У раёне памятаюць пажары 1997, 1999, 2000 гадоў, калі гарэлі плошчы ў сотні гектараў. Вядома, гэта выклікала шмат скаргаў у насельніцтва...

Больш за пяць гадоў таму на балоце Галое пачаліся будаўнічыя работы па ўзвядзенні перамычак на меліярацыйных каналах. Сёння балота наблізілася да канчатковага адраджэння, што дазваляе мясцоваму насельніцтву зарабляць на зборы журавін і чарніц.

У вялікім выйгрышу і мясцовая ўлада, бо прафілактыка тарфяных пажараў абыходзіцца нашмат танней, чым іх ліквідацыя. У выніку паўторнага забалочвання ўдаецца сэканоміць велізарныя грошы. Колькасць пажараў на такіх тэрыторыях значна скарачаецца, а значыць, няма неабходнасці ў выездах падраздзяленняў МНС. Сярод іншых выгод аднаўлення гідралагічнага рэжыму — падтрыманне ўзроўню грунтавых вод на прылеглых землях у міжсезонны перыяд, што спрыяльна ўплывае на вядзенне сельскай гаспадаркі.

Навесці парадак на зямлі — справа больш складаная і шматгранная, чым здаецца на першы погляд... Звычайна адразу ўзгадваюцца чыстыя пасёлкі і вёскі, добраўпарадкаваныя дарогі, дагледжаныя палі і фермы, лясы і ўзлескі без будаўнічага і дачнага смецця. Але калі браць шырэй, то паняцце «парадак на зямлі» ўключае ў сябе падтрыманне гармоніі з навакольным асяроддзем, стварэнне спрыяльных умоў для мясцовай фаўны і флоры, захаванне біяразнастайнасці. А гэта немагчыма без вяртання даўгоў прыродзе, у дадзеным выпадку — аднаўлення парушаных чалавекам балот і тарфянішчаў.

Чэрвень — Мёры.

ЗА ЧЫСТЫ МОТАЛЬ!

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

— Надта прыкра становіцца, калі агульны набытак не цэняць. Людзі могуць паламаць новую лаўку, папсаваць кантэйнер, паставіць машыну пры самай вадзе... Вынікі бескультур'я даводзіцца выпраўляць, і зноў гаварыць пра неабходнасць выхаваўчай работы.

> Вось і зараз у мясцовым гатэлі пражываюць італьянскія спецыялісты, якія прыехалі аказваць тэхнічную дапамогу аднаму з прадпрыемстваў Іванава.

Для гэтага, на думку Сяргея Піліповіча, трэба выкарыстоўваць любую магчымасць і найбольш працаваць з моладдзю. «Навучыць чалавека ўсведамляць сваё месца ў навакольным асяроддзі і сваю адказнасць аказалася задачай яшчэ цяжэйшай, чым знайсці сродкі і тэхніку для навядзення парадку на адным асобна ўзятым аб'екце», — заўважае Сяргей Мікалаевіч. Таму старшыня лічыць сваім абавязкам быць не рэдкім госцем у кожнай з трох школ сельсавета. Сёлета з вучнямі адзінаццатых і першых класаў Мотальскай школы кіраўнік мясцовай улады высадзіў елачкі на адной з вуліц аграгарадка.

За кожнай школай замацаваны кавалак вуліцы, які вучні падтрымліваюць у парадку. Пры гэтым сельвыканкам забяспечвае дзяцей аднаразовымі пальчаткамі, а прадпрымальнікі купляюць пакеты для смецця. Дзеці таксама ўдзельнічаюць у стварэнні вясковай наглядная агітацыі. Напрыклад, на вулічнай сметніцы можна заўважыць спецыяльны надпіс. Часцей за ўсё «Мы за чысты Моталь!» альбо больш разгорнуты лозунг: «Шлях смецця да кантэйнера пралягае праз нашу свядомасць. Будзь свядомым і не засмечвай!». Вучні не толькі збіраюць дробныя адходы ў ваколіцах школы, яны ўдзельнічаюць у творчых праектах па добраўпарадкаванні. (Так, навучэнцы школы мастацтва разам з педагогам Вольгай Калілец на бетоннай агароджы малочнатаварнай фермы побач з адным з уездаў у Моталь зрабілі цудоўную кампазіцыю).

Мотальскі сельсавет хоць і вялікі, але апарат сельвыканкама не адрозніваецца ад іншых. Таму райвыканкам праз упраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне вырашыў пытанне аб увядзенні дадатковай стаўкі рабочага па добраўпарадкаванні на перыяд з красавіка па верасень. А з пазабюджэтных сродкаў сельскі Савет узяў на працу летам яшчэ аднаго чалавека. Такім чынам удалося добра дагледзець вуліцы, газоны, а таксама пляжы і іншыя месцы адпачынку вяскоўцаў.

Калі трэба было, гэтыя рабочыя дапамагалі падкасіць ці прыбраць смецце на могілках. Варта сказаць, што месцы пахаванняў лічаць сваім клопатам усе пяць старастаў двух аграгарадкоў. Пяцёра могілак перададзены апошнім часам на баланс ЖКГ, але і людзі не застаюцца ўбаку.

А яшчэ старасты, паводле слоў старшыні сельскага Савета, праводзяць вялікую

Добраўпарадкаванне — справа кожнага.

арганізатарскую работу: пераконваюць людзей выйсці на суботнік, прывесці ў парадак колькі метраў тэрыторыі насупраць сваёй хаты і ў сваім двары. Ёсць, на жаль, такія, каму трэба аб тым нагадваць... Але большасць жыхароў любіць і падтрымлівае парадак. Сельскі Савет штогод праводзіць конкурсы на найлепшы падворак сярод ветэранаў і маладых сем'яў. Здымкі пераможцаў змяшчаюцца на бачным месцы падчас святочных мерапрыемстваў, якія ў Моталі, як вядома, праходзяць з размахам.

Сёлета на цэнтральных вуліцах Моталя з'явіліся прыгожыя трох'ярусныя кветніцы, якія з вясны да восені радуюць яркімі фарбамі. Адно такое прыстасаванне каштуе тры мільёны рублёў. Купілі іх для роднай вёскі прадпрымальнікі — знешні выгляд свайго населенага пункта яны лічаць не чужой справай.

Зараз сельвыканкам працуе над праектам плана добраўпарадкавання на наступны год. Адным з пунктаў плана, магчыма, стане выраб паказальнікаў, якімі будуць абазначаны гістарычныя кварталы Моталя — раней жа мястэчка ўмоўна падзялялася на чатыры часткі. Сяргей Піліповіч мае задумку ўзнавіць іх назвы для нашчадкаў хаця б у арыгінальных знаках.

yackevich@zviazda.by

Іванаўскі раён.

«МАЛІНАВАЯ» ІДЭЯ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

— Маліна каштуе дорага, — працягвае Жанна Чубса, — а на нашым поўдні краіны яна пачынае паспяваць на тры тыдні раней, чым у Гомельскім раёне, дзе яе даўно актыўна культывуюць. Мы хацелі б, каб наша прадукцыя была сертыфікавана. Улічваючы спецыфіку раёна, шукаем арганізацыю, якая б нас падтрымала. І тады зможам з чыстым сумленнем пастаўляць сваю прадукцыю на рынкі краіны і нават замежжа. Мы хочам, каб нам давяралі, бо Брагінскаму раёну дагэтуль даводзіцца пераадольваць наступствы міфаў і плётак пра радыяцыю.

Эфектыўным стаў і праект ПРААН па вырошчванні экалагічна чыстай гародніны. Выдаткаваныя Br70 млн задаволілі грамадзян, якіх сёння можна назваць паспяховымі фермерамі: яны прапануюць на рынку вялікі асартымент сваёй прадукцыі — ад радыскі і зеляніны да таматаў і баклажанаў.

Першыя вынікі ў выглядзе каштоўных ягад і грошай ад іх продажу прыносіць праект па вы-

Семінар па экалагічным землекарыстанні.

рошчванні буякоў. Святлана Сніцарэнка з вёскі Чамярысы атрымала пад новую культуру Br7 млн. Жанчына купіла 100 саджанцаў, якія вырошчвае па інавацыйных тэхналогіях, ужываючы кроплевы паліў і прытрымліваючыся ўсіх неабходных патрабаванняў да глебы.

Частка ініцыятыў, якія падтрыманы замежнымі грантамі, прысвечана выключна гуманітарным напрамкам: здаровому ладу жыцця і экалогіі, развіццю традыцый і культуры, арганізацыі культурнага і сацыяльнага жыцця ў раёне. На Брагіншчыне рэалізуецца праграма па адкрыцці сямейных клубаў. Сёння іх шэсць, хутка стане восем.

Пры раённым музеі ёсць клуб «Натхненне». Тут занатоўваюць гісторыю Брагіншчыны. Даведаліся, напрыклад, што ў вёсцы Тэльман, дзе рэшткі замка Вішнявецкіх, ёсць камень кахання. Паводле падання, менавіта на гэтым месцы Лжэдзмітрый прызнаваўся ў каханні Марыне Мнішак. Удзельнікі гэтага праекта развіваюць і народны лялечны тэатр — батлейку. Цяпер рыхтуюць спектакль, які гледачы пабачаць на свята Раства.

На Брагіншчыне адкрыты клуб «Матулін ручнік». Гэты праект аб'ядноўвае людзей сталага ўзросту, якім ёсць што ўспомніць. Пенсіянеры збіраюцца разам, спяваюць, узгадваюць, а часам і дэманструюць унікальныя абрады, уласцівыя пэўнай мясцовасці. Летам у госці запрасілі сяброў з 15 раёнаў Гомельшчыны на вялікае мерапрыемства «Ад прадзедаў спакон вякоў», дзе разважалі пра духоўную спадчыну беларусаў.

Практычна ва ўсіх праектах выкарыстоўваліся не толькі сродкі замежных донараў, але і мясцовыя рэсурсы. Таму мяркуецца, што пачатыя ініцыятывы будуць дзейнічаць і развівацца.

iost@zviazda.by

Да канца 2017 года Еўрасаюз выдаткуе 5 млн еўра на рэалізацыю ў Беларусі сумеснага з ПРААН праекта па развіцці мясцовых ініцыятыў. На рэспубліканскі конкурс мясцовых ініцыятыў, праведзены нядаўна, было пададзена больш за 700 заявак ад арганізацый, выканкамаў, жыхароў... Найбольш заявак паступіла з Гомельшчыны.

«СЯМЕЙНЫЯ ХРОНІКІ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Мая цётка расказвала, якімі вясёлымі былі вечарыны. Збяруць некалькі яек і бягуць па гарманіста. Здымалі хату ў якой-небудзь бабулькі і да трох гадзін ночы гулялі. А раніцай трэба было ісці карову даіць, гнаць яе ў статак, а потым яшчэ і ў калгас бегчы, каб зямлі не пазбавілі...

Зараз старшыня сельскага Савета сама можа расказаць шмат цікавага. Працаваць пачынала яшчэ пры Савецкім Саюзе, стаж дэпутацкай дзейнасці — больш чым 30 гадоў. У 1982-м, калі толькі прыйшла ў Васькавіцкі сельсавет, дэпутацкія мандаты мелі аж 35 чалавек, а колькасць насельніцтва даходзіла да 2,5 тысячы. Пасля чарнобыльскай аварыі пачаўся адток жыхароў. Некаторыя з'язджалі сем'ямі. Значна зменшыўся і дэпутацкі корпус. Замест 70 у раённым Савеце засталося 35, а ў сельсавеце наогул 11.

— Але ж спраўляемся, — усміхаецца старшыня. — Тэрыторыя па памерах тая ж, што і раней, а насельніцтва значна паменела, ды і тыя паасобку жывуць. Магчыма, таму зараз такая цікавасць да радаводаў — людзі хоць так імкнуцца адзін да аднаго. Ад каранёў нельга адрывацца.

«Мяне хрысцілі ўпотайкі»

Пра сваіх продкаў Плехава ніколі не забывалася, але да пары трымала ўсё ў галаве. Зараз задумалася над тым, што трэба ўсё сістэматызаваць і аформіць у выглядзе сямейнага дрэва. Бо чым больш праходзіць часу, тым менш застаецца ў памяці цікавых фактаў. Калісьці іх узгадвала маці, але ўжо 10 гадоў мінула, як яе няма. Адзін за адным пайшлі з жыцця дзядзькі, цёткі. Хочацца, каб памяць пра іх таксама захавалася. Бо ўжо выраслі дзеці і нараздзіліся ўнукі. Яны павінны ведаць продкаў. Пакуль існуе чарнавы варыянт радаводу. Засталося знайсці хвілінку вольнага часу, каб сесці за стол і ўсё раскласці па палічках, гэта значыць, па галінках.

— На жаль, далёка паглыбіцца не атрымалася, але я добра ведаю сваіх прадзедаў і прабабак, — паказвае яна ліст паперы, дзе размашыстым почыркам запісаны слупкі імёнаў. — Вось лінія маці. Яе бацька Пётр Фролавіч Цвярдоўскі загінуў на фронце, а маці — Соф'я Іванаўна — памерла ў жніўні 45-га. Падчас жніва разгарачаная папіла ледзяной вады, захварэла і хутка згарэла. Мая маці, Ганна Пятроўна, засталася ў сям'і за старэйшую, і на яе плечы лягло выхаванне трох малодшых сясцёр. Потым сваіх дзяцей гадавала. Наша сям'я была шматдзетнай — у мяне дзве сястры і два браты. Раней нараджалі па 5-6 дзяцей. Не тое, што цяпер. У мяне, як і ў сясцёр з братамі, толькі двое дзяцей.

У сямейных хроніках захавалася гісторыя пра дзеда Герасіма — незаконнанароджанага хлопчыка з сям'і Аніcіма і Вінадоры Кузьміных, бацькавых продкаў. Адна з пяці іх дачок нарадзіла ў дзеўках, і, каб ганьба не заплямiла рэпутацыю вялікага сямейства, Анісім запісаў Герасіма на сваё імя. Ён быў багаты чалавек, меў шмат зямлі і грошай, нават наймаў работнікаў, каб яны апрацоўвалі гэтыя надзелы. Лёс незаконнанароджанага склаўся вельмі ўдала. За яго сасваталі гарадскую нявесту з сям'і старасты, які, акрамя іншага, спяваў разам з усімі сваімі дочкамі ў царкоўным хоры. Адна з дачок старасты — Марыя — была ў Слаўгарадзе наогул знакамітая асоба: у савецкі час хрысціла дзяцей. Зразумела, рабіла яна гэта цішком. Быў выпадак, калі па дарозе ў вёску Кліны да знакамітай сёння на ўвесь белы свет Блакітнай крыніцы яе сфатаграфавалі для «дошкі ганьбы».

— Тым не менш ахвотных хрысціць сваіх дзяцей у яе было шмат, — згадвае Аляксандра Плехава. — Мяне яна таксама хрысціла. У яе быў вялікі крыж, яна здзяйсняла над намі абрад і чытала малітвы.

Архівы сельсавета

Апошнім часам у аматараў складаць радаводы сталі набываць папулярнасць так званыя пагаспадарчыя кнігі. У савецкія гады яны былі ва ўсіх вёсках, па іх вёўся ўлік насельніцтва, свойскай жывёлы, пладова-ягадных дрэў, зямельных участкаў. Там пазначалася інфармацыя па кожным члене сям'і — год нараджэння, адукацыя, месца працы. Па гэтых кнігах органы выканаўчай улады складалі справаздачнасць і вялі фінансава-гаспадарчую дзейнасць.

Аляксандра Плехава дэманструе цэлую бібліятэку такіх кніг. «Даваенныя, на жаль, не захаваліся. Слаўгарадскі раён перажыў дзве акупацыі, праз яго двойчы праходзіў фронт. Але ў нас ёсць кнігі, пачынаючы з 1949 года. У адной з іх знайшлася інфармацыя і пра маю маму, калі яна яшчэ была Цвярдоўская».

Тым, хто ў пошуках сваіх каранёў звяртаецца ў сельсавет, даюць пагартаць гэтыя кнігі. Неяк прыязджаў 40-гадовы жыхар з аграгарадка Ржаўка. Яму вельмі пашчасціла з карыснай інфармацыяй пра свой род. Ён усё сфатаграфаваў і паехаў дадому задаволены.

— Але галоўная каштоўнасць пагаспадарчых кніг у тым, што яны даюць магчымасць людзям вырашыць нейкія праблемы, — адзначае старшыня. — Пасля Чарнобыля, напрыклад, Кульшыцкі сельсавет быў цалкам адселены. Яго функцыі і ўсе дакументы перайшлі да нас. Людзі часцей звяртаюцца па даведкі аб месцы жыхарства на момант аварыі. А жыхарам іншых краін, якія нарадзіліся тут і жадаюць вярнуцца, з нашай інфармацыяй прасцей атрымаць грамадзянства.

Тыя самыя пагаспадарчыя кнігі.

Перад тым, як развітацца, старшыня паказала мне свой дом, дзе нарадзілася. Пабудаваны ён быў аж у 1918 годзе. Там ніхто не жыве, толькі на лета сястра прыязджае. А вось знесці яго рука не падымаецца, таму і грошай на рамонт не шкада. З ім не адна сямейная гісторыя звязана. Дзед працаваў дарожным рабочым і няблага зарабляў, а дом будаваў з такім разлікам, што сям'я будзе вялікая. «4 дачкі — гэта яшчэ не мяжа», — казаў ён. Але пачалася вайна, з якой дзед ужо не вярнуўся. Немцы ж з дома канюшню зрабілі, а пасля таго, як вёску вызвалілі, маці Аляксандры Плехавай, тады яшчэ зусім дзяўчынка, там кішэнны залаты гадзіннік знайшла. Нямецкі. Сям'я памяняла яго на адрэз тканіны...

Нэлі ЗІГУЛЯ. *zigulya@zviazda.by*

Фота аўтара.

ШТО НА СПРАВЕ?

ПРАДСТАЎНІК ДЗЯРЖАВЫ — НЕ «ВЯСЕЛЬНЫ ГЕНЕРАЛ»

Паўнамоцтвы ёсць, але як імі карыстаюцца?

Наяўнасць на балансе акцыянерных таварыстваў аб'ектаў, якія не выкарыстоўваюцца, вядзе да значных затрат на іх утрыманне. Абласны Савет дэпутатаў мае права ў 5 разоў павялічыць для такой маёмасці падатак на зямлю.

Аб гэтым прадстаўнікоў дзяржавы ў акцыянерных таварыствах папярэдзілі на сумеснай калегіі Камітэта дзяржаўнага кантролю Гродзенскай вобласці і фонду «Гроднааблмаёмасць».

Дзяржава з'яўляецца такім жа акцыянерам, як і іншыя ўдзельнікі таварыства. Аднак, улічваючы наяўнасць у ААТ значнай долі акцый, што належаць дзяржаве, менавіта ад яе прадстаўніка залежыць прыняцце канкрэтных рашэнняў па пытаннях работы прадпрыемства, з бачаннем перспектывы яго развіцця. Аднак...

— Як паказаў аналіз, функцыі прадстаўнікоў дзяржавы зводзяцца да прыняцця рашэнняў па размеркаванні прыбытку, выплаце дывідэндаў і прэмій і зацвярджэнні справаздач, — кажа **старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю Гродзенскай вобласці Васіль ГЕРАСІМАЎ**.

У той час, як адзін з галоўных абавязкаў прадстаўніка дзяржавы — гэта абарона эканамічных інтарэсаў дзяржавы ў ААТ, забеспячэнне яго эфектыўнай работы. А што на справе?

— Калі кіраўнік прадпрыемства па «поўнай праграме» адказвае за стратнасць, любое пагаршэнне вытворчых паказчыкаў, то прадстаўнікі дзяржавы застаюцца ў баку, — зазначыў Васіль Герасімаў.

Многія з іх, па сутнасці, самаўхілiліся ад вырашэння праблем прадпрыемстваў — мэтанакіраванай работы па разгрузцы складскіх запасаў, пашырэнні рынкаў збыту прадукцыі, уцягненні ў гаспадарчы абарот маёмасці.

Дарэчы, па стане на 1 лістапада сёлетняга года акцыянерныя таварыствы з доляй уласнасці Гродзенскай вобласці ў статутных фондах прадалі маёмасці, што не выкарыстоўвалася, на суму 4,6 мільярда рублёў. Аднак многія аб'екты па-ранейшаму чакаюць новых гаспадароў. Як паскорыць гэты працэс? На калегіі прапанавалі прымяняць да аб'ектаў ААТ (з доляй дзяржавы больш за 50%) такія ж падыходы, як і да аб'ектаў дзяржаўнай уласнасці — з іх уключэннем у адпаведныя графікі, рашэннямі мясцовых органаў улады і кантролем за ўцягненнем маёмасці ў гаспадарчы абарот.

Сродкі ад продажу такіх аб'ектаў ААТ, у адрозненне ад дзяржаўнай маёмасці, паступаюць на рахункі прадпрыемстваў.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

prakopchik@zviazda.by

Для даведкі:

На тэрыторыі Гродзеншчыны дзейнічаюць 163 ААТ з доляй дзяржавы, у тым ліку 121 — з доляй камунальнай уласнасці вобласці і раёнаў. Дзяржава ўдзельнічае ў кіраванні гэтымі прадпрыемствамі праз сістэму сваіх прадстаўнікоў.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказная за выпуск КАРПЕНКА Н.У.

Грамадскі савет: **ГЕРАСІМОВІЧ С.М.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **АСКЕРКА Ю.В.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **НАВУМЕНКА А.В.**, старшыня Нараўлянскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН: 292 44 12;

e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 20.035. Нумар падпісаны ў 19.30 8 снежня 2015 года.

ПРАВІЛЫ ПРАВЯДЗЕННЯ РЭКЛАМНАЙ ГУЛЬНІ

«НАВАГОДНІ ФЭСТ ПРЫСМАКАЎ СА «ЗВЯЗДОЙ»!»

I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Рэкламная гульня пад назвай «Навагодні фэст прысмакаў са «Звяздой»!» (далей — Гульня) праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з гэтымі Правіламі ў тэрмін з 12 снежня 2015 года па 31 сакавіка 2016 года ўключна з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» на першы квартал ці першае паўгоддзе 2016 года.

2. Арганізатар Гульні — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда» (далей — установа), месца знаходжання: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, УНП 100155376.

II. ПРЫЗАВЫ ФОНД ГУЛЬНІ

3. Прызавы фонд рэкламнай гульні «Навагодні фэст прысмакаў са «Звяздой»!» сфарміраваны за кошт маёмасці арганізатара гульні — рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда» — і складаецца з наступных рэчаў:

№ п/п	Назва	Колькасць (шт.)	Цана за шт. з ПДВ (руб.)	Усяго з ПДВ (руб.)
1.	Мультыварка OURSSON MP 5002 PSD, РФ	7	999 000	6 993 000
2.	Кухонны камбайн Bosch MUM54240, Польшча	1	4 679 000	4 679 000
3.	Кніга «Навагодні фэст ласункаў», РБ	8	5 132,75	41 062

УСЯГО прызавы фонд рэкламнай гульні «Навагодні фэст прысмакаў са «Звяздой»!» складае 11 713 062 (адзінаццаць мільёнаў семсот трынаццаць тысяч шэсцьдзесят два) беларускія рублі.

III. УМОВЫ ЎДЗЕЛУ Ў ГУЛЬНІ

4. Рэкламная гульня «Навагодні фэст прысмакаў са «Звяздой»!» праводзіцца з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» на першы квартал ці першае паўгоддзе 2016 года.

5. Удзельнікам Гульні можа быць любы грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які пастаянна пражывае на яе тэрыторыі і які афарміў і аплаціў падпіску на газету «Звязда» на першы квартал ці першае паўгоддзе 2016 года.

6. Падставай для ўдзелу ў Гульні з'яўляецца дасланая падпісчыкам на адрас установы ў перыяд з 12 снежня 2015 г. па 14 студзеня 2016 года выразаная з газеты або з укладыша ў газету запоўненая картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды», якая змяшчаецца ў газеце не радзей чым раз на тыдзень у перыяд з 12 снежня 2015 г. па 11 студзеня 2016 года.

7. Адзін падпісчык можа даслаць толькі адну картку ўдзельніка. Падпісчык, які даслаў больш за адну картку ўдзельніка, выключаецца з Гульні.

8. Карткі ўдзельніка, наклееныя на паперу ці плёнку, адксераканіраваныя або тыя, якія паступілі ўстанове пасля 14 студзеня 2016 года па паштовым штэмпелі атрымання, да ўдзелу ў Гульні не прымаюцца.

IV. СКЛАД КАМІСІІ ПА ПРАВЯДЗЕННІ ГУЛЬНІ

9. Установа стварае камісію па правядзенні рэкламнай гульні «Навагодні фэст прысмакаў са «Звяздой»!» (далей — Камісія) у наступным складзе:

Крачава Наталля Ільінічна — намеснік дырэктара рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда» — старшыня Камісіі;

Члены Камісіі:

Чычко Аксана Мікалаеўна — начальнік упраўлення распаўсюджвання друкаваных СМІ РУП «Белпошта»;

Міхайлічэнка Алена Віктараўна — загадчыца аддзела падпіскі і рэалізацыі рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда»;

Доўнар Валянціна Аркадзеўна — рэдактар аддзела рэдакцыі газеты «Звязда» рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда»;

Сянько Аляксандр Анатолевіч — спецыяліст 1 катэгорыі адміністрацыйна-гаспадарчага сектара рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда».

10. Асобы, якія ўваходзяць у склад Камісіі, не могуць быць удзельнікамі гэтай Гульні.

V. ПАРАДАК РОЗЫГРЫШУ ПРЫЗОЎ

11. Розыгрыш прызоў ажыццяўляецца на пасяджэнні Камісіі 15 студзеня 2016 года а 12-й гадзіне ў памяшканні ўстановы па адрасе: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

12. Перад пачаткам розыгрышу карткі ўдзельнікаў сартуюцца па абласцях і горадзе Мінску, змяшчаюцца ў асобныя прасторныя скрыні і старанна перамешваюцца.

13. Асобна для кожнай вобласці і для горада Мінска разыгрываюцца па адной мультыварцы.

Затым усе карткі змяшчаюцца ў адну скрыню, перамешваюцца, і сярод удзельнікаў разыгрываецца суперпрыз — кухонны камбайн.

Дадаткова кожны пераможца атрымае кнігу рэцэптаў «Навагодні фэст ласункаў».

14. Пераможцам Гульні, які выйграў прыз, лічыцца ўдзельнік, чыё прозвішча напісана на дасланай ім картцы ўдзельніка, якую пры розыгрышы кожнага асобнага прыза выцягне выпадковым чынам са скрыні хто-небудзь з запрошаных удзельнікаў Гульні або прадстаўнікоў незалежных арганізацый. На кожнай такой картцы ўдзельніка надпісваецца выйграны прыз і распісваюцца члены Камісіі.

15. Вынікі розыгрышу прызоў афармляюцца пратаколам і публікуюцца да 25 студзеня 2016 года ўключна ў газеце «Звязда».

Установа ў тэрмін да 25 студзеня 2016 года дасылае пераможцам паведамленне аб выйграным прызе заказным пісьмом з указаннем тэрміну яго атрымання.

VI. МЕСЦА, ПАРАДАК І ТЭРМІН ВЫДАЧЫ ПРЫЗОЎ

16. Умовай выдачы прызоў з'яўляецца прад'яўленне пераможцам пашпарта або дакумента, які пацвярджае асобу, і арыгінала абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на першы квартал або першае паўгоддзе 2016 года.

Пры звяртанні па атрыманне прыза прадстаўніка пераможцы ён павінен прад'явіць даверанасць на атрыманне прыза, пашпарт і арыгінал абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на першы квартал або першае паўгоддзе 2016 года.

17. Адсутнасць у пераможцы, які выйграў прыз, абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на першы квартал або першае паўгоддзе 2016 года з'яўляецца падставай для адмовы ў выдачы яму прыза ў сувязі з тым, што ён не адпавядае патрабаванням, якія прад'яўляюцца да ўдзельніка Гульні пунктам 5 гэтых Правілаў.

18. Прызы выдаюцца пераможцам у тэрмін па 31 сакавіка 2016 года ў памяшканні ўстановы па адрасе: г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, з 9:00 да 13:00 і з 14:00 да 17:00, за выключэннем выхадных і святочных дзён. Расходы, звязаныя з прыездам пераможцаў па атрыманне прыза, установа не аплачвае.

19. Выплата грашовага эквіваленту кошту рэчавага прыза або замена яго на іншы прыз не дапускаецца.

20. Пасля 31 сакавіка 2016 года выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі ўдзельнікаў не прымаюцца.

VII. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

21. Пераможцы Гульні нясуць адказнасць за падачу падатковай справаздачнасці і за выплату ўсіх падаткаў, прадугледжаных дзейным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь у сувязі з атрыманнем прызоў.

22. Пераможцы Гульні і іх сваякі згаджаюцца з тым, што іх імёны, прозвішчы, імёны па бацьку, фотаздымкі, лісты і інтэрв'ю могуць быць выкарыстаны ўстановай у любых рэкламных і/або інфармацыйных матэрыялах, звязаных з Гульнёй. Яны таксама згаджаюцца даваць інтэрв'ю і здымацца для рэкламных матэрыялаў у сувязі з Гульнёй без выплаты якога-небудзь дадатковага ўзнагароджання. Усе правы на такія публікацыі належаць установе.

23. Правілы правядзення рэкламнай гульні «Навагодні фэст прысмакаў са «Звяздой»!» да пачатку Гульні будуць апублікаваны сумесна з рэквізітамі іх дзяржаўнай рэгістрацыі ў газеце «Звязда».

24. Даведкі, якія датычацца гэтай Гульні, можна атрымаць па тэлефоне (017) 284 44 04.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі рэкламнай гульні №2691 ад 07.12.2015 г. выдадзена Міністэрствам гандлю Рэспублікі Беларусь.

ВЫЯЎЛЕНА АСТМА? РЫХТУЙЦЕСЯ ДА ПРАСТУД

У алергічнай рэакцыі няма ніякай карыснай місіі. Так рэагуе імунная сістэма на самыя звычайныя рэчывы, якія трапляюць да нас з ежай, падчас дыхання ці дотыку. І такіх рэчываў, на вялікі жаль, нямала: яны ёсць і на вуліцы, і дома, і ў тых жа прадуктах. Звычайна алергія заяўляе пра сябе з самых першых месяцаў жыцця. Пазней могуць далучацца новыя віды такой рэакцыі арганізма на нейкія іншыя рэчывы. Пры гэтым здараецца і так, што з цягам часу непрыемны стан праходзіць раз і назаўсёды, а можа і наадварот, пагоршыцца і абумовіць з'яўленне бранхіяльнай астмы. Калі ваша дзіця пакутуе ад алергіі, то першае, аб чым неабходна клапаціцца, — гэта яго лад жыцця. Каб ён быў належным, давядзецца патраціць час. Цудадзейных таблетак ад алергіі пакуль не вынайдзена, а тыя, што ёсць, проста дапамогуць кантраляваць сітуацыю і не дапускаць яе пагаршэння.

На пытанні, якія датычацца гэтай тэмы, падчас завочнай «прамой лініі» адказаў загадчык кафедры паліклінічнай педыятрыі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, доктар медыцынскіх навык, прафесар Уладзімір ЖАРНАСЕК.

Вылечыць цяжка. Але можна кантраляваць

— Крысціна, Рагачоў. Дзіцяці 3 гады. Кашаль і насмарк кожныя два тыдні, аж да ванітаў. Здалі аналіз, выявілася алергія на малако, ялавічыну, бульбу. Ці трэба выдаліць з рацыёну гэтыя прадукты? Ці трэба выдаліць таксама тварог і кефір, калі алергія на цэльнае малако?

— Кашаль і насмарк, верагодна, не алергічнага паходжання. Калі няма прыступаў абцяжаранага дыхання — бранхіяльнай астмы, калі няма скураных праяў — атапічнага дэрматыту, то наўрад ці можна звязваць сітуацыю з алергіяй на бялок каровінага малака, ялавічыну ці бульбу. Калі б гэта было так, то трэба было б поўнасцю выдаляць з рацыёну пералічаныя прадукты, а калі ў дачыненні да малака, то ўсё, што гатуецца з малака, ці тое, куды яго дабаўляюць. Ёсць спецыяльныя прадукты, якімі замяняюць малако пры алергіі. Ёсць прадукты поўнага гідролізу бялку малака і прадукты на аснове амінакіслот. Падбіраць іх можна толькі пасля поўнага абследавання дзіцяці. Што да бульбы, то выяўленыя імуноглабуліны Е яшчэ не ўказваюць на клінічную алергію. Неабходна часовая выдаляць яе з рацыёну, а потым пакрысе ўводзіць, рабіць спецыяльныя правакацыйныя пробы.

— Ганна, Мазыр. Пасля кантакту з клеем з'явілася крапіўніца, апухлі рукі і твар, рукі пачырванелі ў месцы прыпухання. Прапісалі ўколы клемасціну. Але стала горш. Ці можа гэта быць рэакцыя на ўкол? Раней была алергія на ўкус пчалы... Як можна даведацца, ці была алергія на гэты раз?

— Гэта праява кантактнай крапіўніцы на хімічнае рэчыва. Вострая кантактная крапіўніца знікае ў залежнасці ад ступені выражанасці клінічных праяў прыёмам — у таблетаванай форме або ў выглядзе ін'екцый — антыгістамінных прэпаратаў. Клемасцін — добры прэпарат для купіравання вострых сімптомаў скураной алергіі. Алергічныя рэакцыі, па вялікім рахунку, бываюць на любы прэпарат, але ў дадзеным выпадку — наўрад ці.

— Таццяна, Мінск. Дзіцяці 8 гадоў. Пасля знаходжання на сонцы ўсе адкрытыя ўчасткі цела ў яго пакрываюцца чырвонымі плямамі. Што рабіць?

— Тут важна, што сапраўды мае быць — проста чырвоныя плямы або пухіры? Гэта мае значэнне для правільнай пастаноўкі дыягназу. Верагодна, у вашым выпадку размова ідзе аб прамянёвай крапіўніцы. Цяпер неабходна пазбягаць паездак у рэгіёны з актыўнай сонечнай інсаляцыяй, бо можа быць і пагаршэнне сітуацыі. У летні час трэба абараняць скуру ад прамых сонечных прамянёў — надзяваць лёгкую шапачку з шырокімі палямі, адзенне, якое будзе максімальна прыкрываць рукі і ногі. І ў той час, на які прыпадае з'яўленне крапіўніцы, паказаны планавы прафілактычны прыём супрацьалергенных прэпаратаў другога пакалення, дазволеных для працяглага ўжывання. А які менавіта прэпарат і ў якой дозе, трэба абмеркаваць з лечачым урачом. Ён павінен улічыць цэлы шэраг момантаў.

— Вольга, Мінск. Хлопчыку 6 гадоў. Дыягназы: астма, алергічны рыніт, часта танзіліт, фарынгіт. Прымалі фліксацід, сінглон, антырынол. Абструкцыю здымаем сальбутамолам, звычайна — берадуалам і но-шпа з супрасцінам. Да якога спецыяліста нам трэба звярнуцца, каб пазбавіцца зацягнутых захворванняў?

— Астма — хранічнае алергічнае захворванне, якое вылечыць цяжка, можна хіба з дапамогай медыкаментаў кантраляваць. І прыём таго ці іншага супрацьзапаленчага прэпарату — фліксаціду або сінглону — павінен быць вельмі працяглым. Мінімум тры месяцы, пасля чаго, калі дасягаецца пэўны кантроль, аб'ём лячэння змяншаецца і дзіця пераводзяць на тэрапію-падтрымку. Доза-падтрымка прызначаецца дзесьці на год. Дзеці з астмай і алергічнымі рынітамі даволі часта пакутуюць і ад вірусных інфекцый, прастуды, таму што ў іх зніжана абарона слізістых абалонак дыхальных шляхоў. У сітуацыі частых інфекцыйных захворванняў патрабуецца імунастымулюючая тэрапія. Яе можа прызначыць урач-педыятр. Іншая справа, ёсць прэпараты, якія можна прызначаць без ацэнкі зыходнага стану, а ёсць тыя, якія патрабуюць правядзення папярэдняга аналізу. Завочна ж даць рэкамендацыі па канкрэтным прэпараце немагчыма — дзіця трэба бачыць. У першую чаргу неабходна звярнуцца да ўрача-педыятра, а далей пры неабходнасці ён можа накіраваць і да імунолага.

— Кацярына, Орша. У дзіцяці з 3 месяцаў пігментная крапіўніца з адзінкавымі салітарнымі мастацытомамі. У 2 гады былі выяўлены алергены на ўкусы насякомых, а таксама курыцу, малако, таматы, арэхі, морапрадукты, пропаліс, фарбавальнікі, цукар, какаву, хатні пыл. Сталі прытрымлівацца гіпаалергеннага быту. Але плямы не праходзяць. Калолі прэднізалон, але ён не надта дапамагаў. Прайшло неяк само, дзесьці праз тыдзень. Потым было зацішша. Пасля з'явіўся боль у жываце, галаўны боль. Якому спецыялісту нам трэба паказацца?

— Калі дыягназ пігментнай крапіўніцы пастаўлены правільна, то неабходна разумець, што такое захворванне невылечнае. Аднак захворванне можа працякаць з перыядамі паляпшэння. І для гэтага праводзіцца сімптаматычнае лячэнне. У перыяд абвастрэнняў выкарыстоўваюцца супрацьалергічныя прэпараты. Калі на фоне пігментнай крапіўніцы з'явіўся боль у жываце, галаўны боль, то трэба выключыць пашкоджанне ўнутраных органаў. Крапіўніца — гэта мастацытоз, крапіўніца пігментная — гэта скураныя праявы мастацытозу. А ёсць варыянты, калі ўцягваюцца ўнутраныя органы. Таму пачаць трэба з абследавання ва ўрача-педыятра, далей абследаваць вочнае дно ў акуліста, пры паказаннях — правесці рэнтгенаграму, або камп'ютарную тамаграфію, або магнітна-рэзанансную тамаграфію галаўнога мозга, ультрагукавое даследаванне органаў брушной поласці.

— Кацярына, Пінскі раён. Дзіцяці 2,5 года. Дыягназ — атапічны дэрматыт. Лячылі парлазінам, адвантанам, энтэражэрмінай, плюс гіпаалергенная дыета, пастаяннае ўвільгатненне скуры. Перайшлі з грудного кармлення на сумесі. Праз чатыры месяцы паляпшэнняў не было. Здалі аналіз на дысбактэрыёз, выявіўся залацісты стафілакок. Ці ёсць сэнс здаць аналіз на алергію? Ці ёсць сувязь паміж атапічным дэрматытам і перанесенай стрэптадэрміяй? Ці магчыма, што высыпкі праяўляюцца таму, што ў кішэчніку ёсць стафілакок? Што параіце для барацьбы з дэрматытам?

— Я так разумею, гэта ранні пачатак атапічнага дэрматыту. І трэба памятаць, што асноўны алерген у такой сітуацыі — бялок каровінага малака. Таму адразу паўстае пытанне аб безмалочнай дыеце, а гэта не толькі адсутнасць у рацыёне самога малака, але і ўсяго, што гатуецца на малацэ і куды яно дабаўляецца. Каб весці дакладную размову, патрабуецца алергалагічнае даследаванне. Гэта будзе стандартная харчовая панель або вызначэнне ў разнабой алергенспецыфічных антыцелаў да розных харчовых прадуктаў — не экзатычных, вядома, а тых, якімі неабходна карміць дзіця. Адмяняць грудное выкормліванне не трэба было з той прычыны, што перавод на штучнае кармленне здароўя дзіцяці не дабаўляе. Менш алергічнага прадукту, чым грудное малако, не знайсці.

Нельга атаясамліваць атапічны дэрматыт і харчовую алергію. З узростам у дзяцей мяняюцца механізмы развіцця атапічнага дэрматыту. У іх ёсць парушэнне абарончай функцыі скуры: яна лёгка прапускае алергены, якія ёсць вакол нас. Таму з цягам часу да алергіі на харчовыя агенты далучаецца алергія на іншыя.

Залацісты стафілакок, мікрагрыбы любяць такую слаба абароненую скуру. Гэтаксама ва ўсіх дзяцей з атапічным дэрматытам і ў страўнікава-кішачным тракце назіраюцца дысбіятычныя змяненні. У такой сітуацыі, акрамя правільнай дыеты, мясцовага лячэння, догляду за скурай, неабходна і карэкцыя таго ж дысбіёзу. Патрэбны прабіётыкі. Якія — трэба ведаць, напрыклад, як доўга высяваецца стафілакок і іншыя моманты.

Рыс без малака, сок без цукру

— Андрэй, Гомель. У мяне больш за 2 месяцы закладзены нос, насмарк, чханне. Алергіі ніколі не было. Гаймарыту няма. Прызначылі ларатадзін і спрэй вібрацыл. Але не надта дапамагае. Што рабіць?

— Калі вам да 18 гадоў, то ў першую чаргу трэба падазраваць алергічны працэс. І калі не дапамагаюць антыгістамінныя прэпараты, якія вы назвалі, у тым ліку ў выглядзе спрэю, то пытанне трэба ставіць аб прызначэнні інтраназальных глюкакортыкастэроідаў. Калі вам больш за 18 гадоў, то трэба падазраваць вазаматорны рыніт. З гэтым і павінен разабрацца ўрач-алерголаг для дарослых.

— Яўген. Алергічныя рэакцыі пачынаюцца напрыканцы мая і доўжацца да пачатку жніўня — чханне, сверб у носе, закладзенасць носа, вочы свярбяць і чырванеюць, а пасля і падпухаюць, калі няма магчымасці ўжыць прэпарат. Як быць?

— Вы апісваеце класічныя прыкметы пылковай алергіі, палінозу ў выглядзе сезоннага алергічнага рыніту і кан'юнктывіту. Першае выйсце — лячэнне прафілактычнае і па факце ў час абвастрэння палінозу. Гэта будзе прыём супрацьалергічных прэпаратаў другога пакалення. Калі іх не хапае, то і супрацьалергічныя кроплі ў вочы, калі і іх не хапае, то і ў нос. Канкрэтны аб'ём лячэння трэба вызначаць з улікам вашага ўзросту і непасрэдна падчас прыёму. Для гэтага існуюць спецыялісты — тэрапеўты і отарыналарынголагі. Другое выйсце — гэта вызначыць спачатку, на што канкрэтна ёсць алергія. Верагодна, гэта пылок злакавых, дзікіх і культурных. З канца верасня-кастрычніка трэба звярнуцца да ўрача-алерголага, паставіць скураныя пробы з пылковымі алергенамі і ўдакладняць, на што ў вас ёсць рэакцыя. Далей алерголаг будзе вырашаць пытанне аб лячэнні — яно будзе планавым, працяглым, каб зрабіць арганізм максімальна не адчувальным да падобнага ўздзеяння.

— Аліна, Мінск. У дзіцяці на штучным выкормліванні на целе з'явіліся чырвоныя шурпатыя плямкі і высыпкі на шочках. Урач паставіў дыягназ — атапічны дэрматыт, прызначыў фенісціл, гарманальную мазь і сродкі для ўвільгатнення. Часова гэтыя меры дапамагалі, але хутка зноў усё паўтарылася. Перайшлі на сумесь «Фрысапеп» — скура істотна ачысцілася. Зараз дзіцяці 7 месяцаў, не можам увесці прыкорм, на ўсё высыпае. Пасля прышчэпак — таксама абвастрэнне. Што рабіць?

— Размова ідзе пра алергію на бялкі каровінага малака. Узрост дзіцяці патрабуе ўжо ўвядзення прыкорму. Гэта можа быць монакампанентная каша — безмалочныя рыс, грэчка. Другі прыкорм — монакампанентнае пюрэ з гародніны, часцей гэта кабачкі, трэці прыкорм — монакампанентнае мясное пюрэ — гэта свініна, бараніна або трусяціна, далей — монакампанентныя сокі і фруктовыя пюрэ без цукру — пачынаем звычайна з яблычнага. Новы прыкорм даём у невялікай колькасці (як, дарэчы, і здаровым дзецям). Калі пераносіцца добра, значыць, уводзім да адпаведнай узросту нормы цягам сямі-дзесяці дзён. Але найлепш у вашай сітуацыі прайсці алергалагічнае даследаванне, вызначыць алергенспецыфічныя антыцелы ў крыві і выбраць у першую чаргу тыя, на якія няма гэтых антыцелаў або ўзровень нізкі. Гэта дапаможа з большым поспехам уводзіць прыкормы.

— Ірына, Мінская вобласць. Праз нейкі час пасля нанясення касметыкі павекі пачынаюць свярбець. Пасля змывання яны чырванеюць, прыпухаюць. Дзе можна здаць аналіз для выяўлення кампанента, які гэта правакуе?

— Вы апісалі класічны кантактны дэрматыт. Самае разумнае — адмовіцца ад касметыкі. Таму што кампаненты ўсіх касметычных сродкаў для вачэй вельмі падобныя. Другі варыянт — падбіраць, што вы пераносіце. Ніякі аналіз тут не прапануеш — яго проста не існуе. Але ўсё ж такі паспрабуйце спачатку цалкам адмовіцца ад касметыкі цягам паўгода, а пасля паспрабуйце вярнуцца да яе выкарыстання.

— Ганна, Віцебск. Сыну 3 гады, ад нараджэння алергія на пшанічную муку, поўсць ката, арахіс, фундук. Праяўляецца плямкамі, якія свярбяць. Урач сказаў, што дзіця адносіцца да групы рызыкі па бранхіяльнай астме. Калі мы пайшлі ў садок, то плямкі зніклі, але з'явіўся моцны кашаль. Ці магчыма, што алергія праяўляецца кашлем, і ці можна пры такіх паказчыках ужываць якія-небудзь малочныя прадукты?

— Вы пакінулі мала інфармацыі, а таму немагчыма даць канкрэтных рэкамендацый. Першае, аб чым хочацца сказаць, — дзіця пайшло ў садок, а гэта азначае і непазбежнае ўзнікненне рэспіраторных вірусных інфекцый. Калі гэта інфекцыі, то пры чым тут алергія? Толькі калі кашаль працяглы, упарты і супадае з ужываннем нейкіх харчовых прадуктаў, тады можна гаварыць аб алергіі.

— Любоў Андрэеўна, Мінск. Дзіцяці 3 гады. Апошнія паўгода мы ніяк не можам пазбавіцца алергічнага дэрматыту, які праяўляецца свербам, коркамі пад каленямі, пачырваненнем шчок. Лячэнне ў алерголага дало свае вынікі, заўважнае паляпшэнне ёсць, але да канца ўсё не праходзіць, застаецца моцны сверб па начах. З фруктаў і ягад нам можна яблыкі, грушы, чарніцы, чарнасліў, жоўтыя слівы. Дзіцяці ў садку двойчы ў дзень даюць па 200 мл яблычнага соку. Я лічу, што гэта для нас зашмат. Ці я даремна хвалююся?

— Атапічны дэрматыт застаецца ў гэтым узросце залежным ад харчовых алергенаў, але далучаюцца і іншыя віды сенсібілізацыі. Сверб па начах можа якраз сведчыць аб фарміраванні сенсібілізацыі да аэраалергенаў, якія ёсць у паветры, і да кляшчоў хатняга пылу, што ёсць у падушках і коўдрах. Дзіця, якое наведвае садок, не можа прытрымлівацца гіпаалергеннай дыеты. Нават у самым найлепшым садку ніхто не арганізуе такі стол. Таму трэба разбірацца. Калі скураны працэс сапраўды цяжкі, то трэба ставіць пытанне аб спыненні наведвання садка. Аб'ём жа соку — 400 мл у дзень — вялікі для 3-гадовага дзіцяці. Але ці сапраўды ў садку даюць столькі соку?

— Ірына, Гомель. Лячылі дзіця інгаляцыяй з салявым растворам і закапвалі оксіметазалін. З'явіўся сухі кашаль, прызначылі інгаляцыю, пасля чаго спіна пакрылася сыпам, пачырванела, а раніцай пачырванелі жывот і твар, да таго ж твар крыху прыпух. Аказалася, што высыпкі былі змешанымі: алергаінфекцыйнымі. Што нам цяпер рабіць?

— Трэба прааналізаваць, чым вы кармілі дзіця і ўсе медыкаменты, якія яно прымала. А далей трэба разабрацца: гэта была рэакцыя на кампаненты інгаляцыі, або на антыбактэрыяльныя сродкі, або на нейкую ежу, якую ў гэты час атрымлівала дзіця. У першую чаргу гэтае ваша пытанне павінен дапамагчы вырашыць урач-педыятр. Калі ён заўважыць праблему, то можа накіраваць і да алерголага. І праблему трэба бачыць у працяглым стане, а тое, што ўзнікла і прайшло, — тут алерголагу няма з чым разбірацца.

— Вольга. Дзіцяці ў 1 год ставілі атапічны дэрматыт, прызначалі крэон і лінэкс. Урач сказаў, што да 3 гадоў звычайна гэта праходзіць. Прайшло нават крыху раней. Дзіця наведвае садок. А раптам у нас ёсць алергія на харчовыя прадукты? Ці варта рабіць алергапробы?

— Ёсць паняцце алергіі на харчовыя прадукты, а ёсць — сенсібілізацыя, павышаная адчувальнасць. Алергія мае клінічныя праявы, а павышаная адчувальнасць можа быць у выглядзе змяненняў іммунай сістэмы на харчовы прадукт, але клінічна захворвання няма. Вы ставіце пытанне, хутчэй, пра сенсібілізацыю. Скажу так: калі ўзяць усіх здаровых людзей і паставіць ім алергапробы, вызначыць алергенспецыфічныя антыцелы, то сенсібілізацыя да харчовых прадуктаў выявіцца ў 10-30 працэнтаў. Але гэта латэнтны, схаваны працэс, клінічна нязначны. Ці трэба вам такое даследаванне — гэта пытанне. Паказанняў жа для яго няма.

Бясцэннае грудное кармленне

— Антаніна Мікалаеўна, Гродзенская вобласць. Атапічны дэрматыт з дзяцінства, але ніякіх абвастрэнняў на ежу не было. Непакоіць сверб, экзэмы, запаленне лімфавузлоў. Лячылі дыпраспанам, рознымі антыгістамінныміі прэпаратамі, рабілі плазмаферэз, курс дэксаметазону і інш. Што вы можаце параіць?

— Ці праводзілася алергалагічнае абследаванне дзіцяці, у тым ліку на харчовыя алергены, аэраалергены? Ці атрымлівала дзіця ў раннім узросце гіпаалергенную дыету? Колькі гадоў дзіцяці цяпер? Ад гэтага залежыць тактыка лячэння. Калі дзіця ранняга ўзросту, то трэба мець на ўвазе харчовую алергію, разбірацца з вядучым алергенам і выдаляць яго з рацыёну. Калі дзіця старэйшага ўзросту, то харчовая алергія мае меншае значэнне. Агульны прынцып — догляд скуры, мясцовая супрацьзапаленчая тэрапія, а менавіта гарманальныя і негарманальныя мазі, антыгістамінныя прэпараты. Нарэшце, дзецям з упартым дэрматытам прызначаецца сістэмнае лячэнне імунасупрэсіўнымі прэпаратамі, адным з якіх з'яўляецца цыкласпарын. Вам неабходна пракансультавацца ва ўрача-алерголага і, можа быць, шпіталізаваць дзіця ў алергалагічнае аддзяленне для поўнага абследавання і лячэння. Трэба мець на ўвазе, што лячыць атапічны дэрматыт складана, можна толькі больш-менш паспяхова кантраляваць яго.

— Ганна, Мінск. Дзіцяці 6 гадоў. Алергія на пыл, поўсць катоў і палявыя кветкі. Дыягназы: бранхіяльная астма, мікаплазма. Непакоіць сухі кашаль. Прапісалі фліксацід, але ён перастаў дапамагаць. Як лячыць дзіця? Як можна ўмацаваць яго імунную сістэму?

— Ёсць паняцце астмы кантралюемай і некантралюемай. Калі гэта апошні варыянт у выпадку з прызначаным урачом прэпаратам, значыць, трэба гаварыць аб паказаннях павелічэння аб'ёму лячэння — дозы фліксаціду або прызначэнні камбінаванай тэрапіі, выбар якой залежыць ад узросту. У вашай сітуацыі гэта можа быць камбінацыя таго ж фліксаціду з сальнетэролам або з мантэлукастам. Што да ўмацавання імуннай сістэмы, то, калі дзіця часта хварэе на прастуды, патрабуецца імунастымулюючая тэрапія. Яе выбар залежыць ад узросту і ад таго, ці зроблена даследаванне імуннай сістэмы. Калі яно не праводзілася, то прызначаюць імунастымулюючыя прэпараты, якія не патрабуюць такога аналізу, а калі зроблена, то ўрач адштурхоўваецца пры выбары прэпарату ад выяўленай праблемы ў імунітэце. Можна звярнуцца для гэтага да ўрача-педыятра, які накіруе да ўрача-імунолага.

— Алеся, Гродна. Дзіцяці 6 гадоў. Бранхіты, пнеўманіі, алергічныя рэакцыі. Алергія на бярозу, пылавога кляшча, какава-бабы. Прадукты выдалілі з рацыёну, але вірусныя захворванні не спыняюцца. Ці ёсць тут сувязь?

— Тут важна, калі менавіта гэтыя вірусныя захворванні бываюць. Вясной-летам пад віруснымі захворваннямі можа хавацца пылковая алергія. Калі гэта сапраўды вірусы і дзіця адносіцца да ліку тых, хто часта хварэе, то, як і любое малое, схільнае да такой інфекцыі, яго трэба загартоўваць, з ім трэба дастаткова бываць на свежым паветры, неабходна забяспечыць адпаведнае ўзросту рацыянальнае харчаванне, дабаўляць вітамінатэрапію восенню і зімой. Магчыма, паўстане пытанне і аб прызначэнні імунастымулюючых прэпаратаў. Адносна гэтых лекаў хачу адразу падкрэсліць, што не існуе цудадзейнай таблеткі, якая на сто працэнтаў зменшыла б частату рэспіраторных вірусных захворванняў. У кожнага дзіцяці свае асаблівасці імуннай сістэмы, і яе адказ на адзін і той жа імунастымулюючы прэпарат у розных дзяцей будзе розным. Імунастымулюючыя прэпараты здольны зменшыць частату рэспіраторных вірусных інфекцый максімум на 10-40 працэнтаў. Большага ад іх патрабаваць немагчыма. Усім бацькам, чые дзеці часта хварэюць і наведваюць садок, магу сказаць толькі адно: вашаму дзіцяці там не месца. На нейкі час трэба заняцца ім дома і рабіць тое, што я пералічыў вышэй. Калі няма куды падзець дзіця і яно будзе працягваць наведванне садка, то трэба дакладна ўсведамляць, што туды яно будзе хадзіць па чарговую інфекцыю.

Дзеці з астмай і алергічнымі рынітамі даволі часта пакутуюць і ад вірусных інфекцый, прастуды, таму што ў іх зніжана абарона слізістых абалонак дыхальных шляхоў.

— Марына, Наваполацк. Падкажыце, калі ласка, ці можа лячэнне гістаглабулінам аслабіць імунітэт? Здаецца, ёсць алергія, якая праяўляецца чханнем.

— Гістаглабулін часта прымяняюцца пры алергічных захворваннях, каб зменшыць клінічныя праявы алергіі. Нейкі час гэты метад лячэння прымяняўся досыць шырока. Пасля было заўважана, што некаму прэпарат дапамагае, а некаму не дапамагае зусім, а таму яго ў апошні час выкарыстоўваюць значна радзей. Ніякага дачынення да аслаблення імунітэту гістаглабулін не мае. Чханне — гэта, як правіла, сімптом алергічнага насмарку. Таму трэба разбірацца, якая ступень цяжкасці алергічнага рыніту, з чым ён звязаны. Вам паказана алергаабследаванне.

— Людміла Мікалаеўна, Калінкавічы. Дачцэ 4 месяцы, у яе на шчочках, на целе — чырвоныя шурпатыя плямкі. У мяне таксама ёсць такі дэрматыт, які падчас цяжарнасці абвастрыўся. Даём дзіцяці харчаванне «Нутрымон-пепцігастра» з расшчэпленым бялком. Стала крыху лепш. Падкажыце, якім павінна быць наша харчаванне? Як часта можна карыстацца маззю «Адвантан» і якія яшчэ можна выкарыстоўваць? Ці могуць высыпкі быць рэакцыяй на прышчэпку ад гепатыту В? Ці можна цяпер рабіць іншыя паказаныя прышчэпкі або трэба нейкі час пачакаць?

— Атапічны дэрматыт мае ў многіх дзяцей спадчынную схільнасць. Яна і рэалізавалася ў вашым выпадку. Каб рызыка рэалізацыі спадчыннасці была мінімальнай, дзіця трэба было карміць і працягваць гэта рабіць да сённяшняга часу грудным малаком. Вакцыны разам з іншымі фактарамі — ежай і г.д. — могуць выклікаць абвастрэнні алергічных захворванняў. Гэта ніхто не хавае, але жыць у сучасным свеце без прафілактычных прышчэпак немагчыма. Вашаму дзіцяці ўсе гэтыя прышчэпкі не проціпаказаны на фоне заціхання атапічнага дэрматыту. Са стапрацэнтнай верагоднасцю можна меркаваць, што размова ў вашым выпадку ідзе пра алергію на бялкі каровінага малака. Неабходна лячэбная сумесь на аснове поўнага гідролізу бялка каровінага малака. Гэта можа быць, напрыклад, «Альфарэ», «Фрысапеп». З 5 месяцаў неабходна ўводзіць прыкормы. Як яны будуць пераносіцца, сказаць цяжка. Пачынаць трэба з безмалочнай кашы. Лепш перад увядзеннем прыкорму вызначыць алергенспецыфічныя антыцелы ў крыві да харчовых прадуктаў і пачынаць прыкормы з тых прадуктаў, да якіх няма або вельмі нізкія ўзроўні імуноглабуліну Е.

**Святлана БАРЫС

НАШ ЛЮБІМЫ ТРЫКАТАЖ

Сорак гадоў ААТ «Світанак» вырабляе натуральны якасны трыкатаж для дзяцей і дарослых. Вядомы беларускі брэнд заваяваў любоў не толькі айчынных, але і замежных спажыўцоў у Расіі, Казахстане, Украіне, Прыбалтыцы і іншых краінах.

СВІТАНАК

МАШЫНА МОЖА ЎСЁ

Адзенне ад «Світанка» цалкам адпавядае патрабаванням пакупніка, што не так і проста ў сучасных умовах. Галоўны сакрэт, як высвятляецца, у тым, каб адмыслова арганізаваны вытворчы працэс дазваляў рэгулярна абнаўляць шырокі асартымент трыкатажу для дзяцей і дарослых. Мадэрнізацыя вытворчасці, праведзеная ў апошнія некалькі гадоў, зрабіла магчымым выраб такога адзення, якое не саступала б шэрагу сусветных брэндаў.

— Неабходнай умовай павелічэння выпуску прадукцыі, далейшага паляпшэння яе якасці, пашырэння асартыменту з'яўляецца пастаяннае абнаўленне тэхнічнай базы, — тлумачыць **намеснік дырэктара па ідэалагічнай рабоце ААТ «Світанак» Алена ШЫШКО.** — За апошнія пяць гадоў удалося рэалізаваць каля дзесяці інвестыцыйных праектаў, на абнаўленне асноўнага капіталу было накіравана больш як 13 млрд рублёў. Дзякуючы сучаснаму абсталяванню вядучых вытворцаў з Германіі, Нідэрландаў, Швейцарыі і Італіі выпускаецца больш за 7 тысяч тон трыкатажнага палатна ў год, з якога пасля мы шыем больш за 17 млн вырабаў.

На прадпрыемстве абнавілася значная частка швейнага абсталявання. Вязальны цэх цяпер аснашчаны такім абсталяваннем вядучых еўрапейскіх фірмаў, што можна вырабіць фактычна любы від палатна — кулірную гладзь, ластык, інтэрлок, малюнкавыя тканіны — плюшавыя, футараваныя і іншыя. У фарбавальным цэху ўстаноўлены сучасныя апараты нямецкай фірмы — машыны інжэктарнага тыпу, а таксама фарбавальны апарат аэрадынамічнага спосабу фарбоўкі для дасягнення эфекту «мультыкалор». Друкарскае абсталяванне выконвае друк на любых, у тым ліку самых тонкіх, трыкатажных палотнах. Электронныя вышывальныя машыны вытворчасці Германіі і Японіі робяць вышыўкі з аплікацыямі да дзевяці розных па таўшчыні і колеры вышывальных нітак у адным малюнку.

ГЭТА БУДЗЕ БЯСПЕЧНА

Усё робіцца з натуральных валокнаў, з бавоўны. Такое адзенне, як вядома, вылучаецца асаблівай камфортнасцю і гігіенічнымі вартасцямі, а ў выпадку «Світанка» — гэта яшчэ аптымальнае спалучэнне высокай якасці і даступнага кошту. Спецыялісты прадпрыемства, у тым ліку мастакі і дызайнеры, рэгулярна ўдзельнічаюць у конкурсах прафесійнага майстэрства рэспубліканскага і міжнароднага ўзроўняў, дзе заслужана атрымліваюць высокія ўзнагароды.

— Назапашаны вопыт і кваліфікаваны персанал дазваляюць нам выпускаць прадукцыю, якая адпавядае ўсім неабходным патрабаванням, — кажа **намеснік дырэктара па эканоміцы ААТ «Світанак» Аляксандр РУБАНЦАЎ.** — Нашы вырабы ні ў чым не саступаюць аналагічнай еўрапейскай прадукцыі, але пры гэтым таннейшыя. Якасць адпавядае патрабаванням стандартаў Беларусі, краін СНД і далёкага замежжа. Уся прадукцыя сертыфікавана па паказчыках бяспекі ў Нацыянальнай сістэме сертыфікацыі і прайшла гігіенічны рэгламент. Хімікаты і фарбавальнікі завозім, напрыклад, з Германіі і Швейцарыі. Уся сыравіна — пража, ніткі, фарбавальнікі і нават фурнітура — праходзяць строгі кантроль якасці ў нашай лабараторыі. Не эканомім на гэтым, паколькі захаванне здароўя спажыўцоў і нашай рэпутацыі — самае важнае. Дзякуючы такой унутранай палітыцы мы маем устойлівы попыт на тым жа расійскім рынку, які з'яўляецца нашым асноўным экспарцёрам. Невялікія партыі пастаўляем і ў такія краіны, як Германія, Фінляндыя, Македонія, Малдова і іншыя.

Сёння ўжо 25 фірменных магазінаў «Світанка» працуюць па краіне, у самім Жодзіне ёсць дзве фірменныя крамы і секцыя ва ўнівермагу. У планах — павышэнне эфектыўнасці гэтых пунктаў гандлю. Спецыялісты аналізуюць іх напаўненне, разглядаюць варыянты спадарожных тавараў, якія там могуць быць прадстаўлены, акрамя асноўнага асартыменту (можа быць, абутак, шкарпэткі). А ўвогуле для пашырэння паставак унутры краіны атрымлівае развіццё ўжо і выязны гандаль. Такая практыка добра сябе зарэкамендавала, напрыклад, у санаторна-курортных установах, дзе адпачывае нямала замежнікаў. Наладжаны і электронны гандаль — праз партал wildberries.by. Ідзе распрацоўка і ўласнага сайта для арганізацыі інтэрнэт-продажу. Налета плануецца стварыць лагістычную структуру для продажу тавару на рынках Расіі і Казахстана.

У сувязі са святкаваннем
40-годдзя
фабрыка «Світанак» праводзіць ва ўсіх сваіх фірменных магазінах
ДЗЕНЬ ЗНІЖАК.
15 снежня
кожны пакупнік атрымае
10-працэнтную зніжку і дысконтную картку ў падарунак!

«Світанак» застаецца найбуйнейшым у краіне прадпрыемствам па вырабе трыкатажнай бялізны і верхняга трыкатажу для дзяцей і дарослых. Фабрыка, размешчаная ў Жодзіне, ажыццяўляе поўны цыкл вытворчасці — ад вырабу палатна да выпуску гатовых рэчаў. Прадпрыемства мае вязальны, фарбавальны, закройны і два швейныя цэхі, некалькі дапаможных службаў і вялікую складскую гаспадарку. Працуюць на «Світанку» каля 2,5 тысячы чалавек, большасць з якіх — жанчыны.

УСЕ ЭТАПЫ НАРАДЖЭННЯ

Падставай для вытворчасці нейкага вырабу з'яўляюцца маркетынгавыя даследаванні, прагноз асноўных накірункаў развіцця асартыменту і моды ў адзенні. З'яўляецца план паэтапнай распрацоўкі калекцый. Паводле плана складаецца тэхнічнае заданне на распрацоўку новых малюнкаў, каларытаў і мадэляў.

Мастак-мадэльер распрацоўвае эскіз мадэлі, па якім шыецца аўтарскі ўзор. Аўтарскія мадэлі разглядае мастацка-тэхнічны савет прадпрыемства.

За некалькі месяцаў складаецца папярэдняя заяўка на новыя мадэлі, прынятыя саветам. На гэтым этапе да работы далучаюцца канструктары, раскладчыкі лекалаў, тэхнолагі.

Распрацоўваюцца тэхнічная дакументацыя, лекалы і адшываецца ўзорны эталон.

Планава-вытворчы аддзел складае заяўку на вытворчасць, па якой пралічваюцца ўсе неабходныя сыравіна, фурнітура і г.д. для выканання заяўленых мадэляў.

Цяпер усё неабходнае для вытворчасці ёсць. Пачынаецца працэс вязання палатна.

— Выпускаем практычна ўсе віды трыкатажных палотнаў — ад кулірных да плюшавых і з апрацоўкай пад аксаміт, — удакладняе **галоўны тэхнолаг ААТ «Світанак» Святлана САМСТЫКА.** — На заводзе ўстаноўлена сучаснае вязальнае абсталяванне вядомай нямецкай фірмы Mayer&Ci. Палатно збіраюць у партыі вагой да 300 кг і адпраўляюць у фарбавальныя апараты для афарбоўкі або адбельвання на абсталяванні нямецкіх і італьянскіх фірмаў Thes і MCS. Мокрае палатно адціскаецца на лініі водаціску Corino і сушыцца на сушыльных машынах Unitech, Brukner. Гладкафарбаванае палатно гатовае. Пры неабходнасці можна наносіць друк на ратацыйнай друкаванай машыне Zimmer. І зноў палатно стабілізуюць на сушыльна-шырыльнай машыне.

Цяпер палатно паступае ў закройны цэх, дзе яго высцілаюць і раскройваюць на раскройна-насцілачным комплексе нямецкай фірмы Kuris. Гатовы крой ідзе ў швейны цэх, дзе ў залежнасці ад складанасці на пашыў адной адзінкі затрачваецца ад 20 хвілін да 1 гадзіны.

ПАД СПЕВЫ «БЕЛАЙ РУСІ»

«Світанак» сёння — гэта досыць стабільны калектыў, які, тым не менш, папаўняецца і маладымі кадрамі. А першае, што патрабуецца новаспечаным спецыялістам, — жыллё. За апошнія гады каля прадпрыемства вырас цэлы фабрычны гарадок. Ёсць шэсць інтэрнатаў, а днямі быў урачыста здадзены дом на 108 кватэр.

— У нас на балансе застаецца стабільная колькасць інтэрнатаў — маладзёжнага і сямейнага тыпу, — расказвае **старшыня прафкама ААТ «Світанак» Таццяна ЗАБАРОЎСКАЯ.** — Запаўненне адбываецца, галоўным чынам, маладымі рабочымі, якія прыязджаюць па размеркаванні. Некалькі чалавек прыехалі і сёлета. Думаю, яны задаволены нашым клопатам аб іх пражыванні. Па магчымасці трымаем на ўзроўні нашу сацыяльную сферу. У нас працуе пункт аховы здароўя, дзе прыём вядуць нават такія вузкія спецыялісты, як урач-стаматолаг і ўрач-гінеколаг. Ёсць бібліятэка з кніжным фондам каля 14 тысяч кніг. Вось ужо пяць гадоў, як адкрылі нават свой музей. Займаемся і арганізацыяй экскурсій, у тым ліку на прагляд спектакляў у тэатрах Мінска. Ёсць трэнажорная зала, абанементы ў басейн прапануем са зніжкай. Актыўным гастралёрам па краіне стаў наш ансамбль «Белая Русь», які праслаўляе прадпрыемства на розных рэспубліканскіх мерапрыемствах. Дарэчы, яго выступленне парадуе калектыў і падчас святкавання юбілею «Світанка».

АРЫГІНАЛЬНА!

Зараз у магазінах мы набываем вырабы з калекцыі восень-зіма – 2015. Халодны час года — гэта традыцыйна больш бялізны, сарочак і піжам. Аднак не за гарамі зноў пацяпленне, і нам спатрэбяцца фуфайкі, джэмперы, топы... «Ёсць класічная базавая калекцыя, дзе абнаўленне можа быць толькі па колеры, малюнках, але самі мадэлі застаюцца нязменнымі, гэта класіка, — тлумачыць **начальнік бюро маркетынгу ААТ «Світанак» Марыя ЛАПАЦЕНКАВА.** — А вось сезонныя калекцыі мяняюцца фактычна цалкам. Калекцыя вясна-лета — 2016 ужо фактычна сфарміраваная, засталіся пэўныя фармальнасці перад тым, як творчы пошук завершыцца тэхналагічным працэсам масавага шыцця».

Сучаснае адзенне павінна быць якасным, зручным і абавязкова модным. Спажывец хоча, каб матэрыял быў мяккім, апрацоўка арыгінальнай, пакрой сучасны, а кошт даступны. І тут удаецца ўсё гэта спалучаць, у тым ліку ў ясельным асартыменце і трыкатажы для дзяцей малодшага школьнага ўзросту. Клапатлівым татам і мамам добра вядомыя гандлёвыя маркі для згаданых узроставых груп «Кука-Вака» і FISHKA. А для саміх дарослых — гандлёвая марка з аднайменнай назвай «Світанак».

Кожная калекцыя для кожнай узроставай катэгорыі ўлічвае пэўныя асаблівасці, што адлюстроўваецца і ў даўжыні, і ў палотнах, і ў колеравай гаме. Палотны могуць быць і змяшанымі — з віскозай, спандаксам і інш. У аснове, безумоўна, бавоўна з дабаўленнем штучных нітак для ўстойлівасці формы.

Творчы патэнцыял прадпрыемства — гэта чатыры мастакі набіўных палотнаў і друку, тры мастакі-мадэльеры і два каларысты. Штомесяц кожны мастак стварае не менш за 20 мадэляў. Калекцыя вясна-лета ўжо гатовая, прэзентуецца мастацкаму савету.

Мастакі-мадэльеры падчас сваіх распрацовак улічваюць, якія мадэлі прадугледжаны планам, што гэта будзе за шкала памераў, якое палатно і г.д. Зацверджаныя тэхналагамі і аддзелам маркетынгу эскізы мадэльераў перадаюцца канструктарам, якія вызначаюць характар малюнку і колеравую гаму. Урэшце гатовы выраб прадастаўляецца мастакамі на зацвярджэнне мастацкаму савету, у які ўваходзяць канструктары, тэхнолагі і кіраўніцтва прадпрыемства. Такім чынам кожныя паўгода неабходна сфарміраваць каля 400 мадэляў.

— Мы традыцыйна бяром удзел у маскоўскіх выстаўках у верасні і лютым, а таксама ў выставе «Беллегтэхпрам» у Мінску, — адзначае **начальнік аддзела маркетынгу, рэкламы і дызайну ААТ «Світанак» Алена РАМАНАВА.** — Гэта не проста імідж прадпрыемства, але і заключэнне дагавораў, пошук новых партнёраў. Мастакі-мадэльеры выязджалі сёлета і на выставу ў Польшчу. Удзел у такіх мерапрыемствах вельмі важны. Трэба адчуваць модныя тэндэнцыі, натхняцца, нараджаць новыя ідэі, якія будуць апярэджваць любыя жаданні пакупніка.

ВІНШАВАЛЬНЫ ЛІСТ

Дырэктар ААТ «Світанак» Юрый ЛУКАШЭВІЧ:

— Дазвольце выказаць словы ўдзячнасці ўсім работнікам прадпрыемства з дастойнай гісторыяй. Дзякуй за добрую работу, якую вы робіце прафесійна, якасна, самаадданa!

Віншую ўвесь наш шаноўны калектыў з 40-годдзем з дня ўтварэння фабрыкі, якая з'яўляецца вядомым брэндам Беларусі. Зычу кожнаму асабіста шчасця, здароўя і натхнення! І няхай вялікая частка нашай работы застаецца для нашых спажыўцоў за кадрам, але галоўнае, што яны з задавальненнем могуць карыстацца адзеннем, зробленым з любоўю. Са святам усіх нас!

ТАК БЫЛО

Філіял Мінскага вытворчага аб'яднання «Прагрэс» — Жодзінская швейна-трыкатажная фабрыка — была ўведзена ў эксплуатацыю 15 снежня 1975 года. Выпускала прадпрыемства бялізну трыкатажную і спартыўную.

Дзяржаўны Знак якасці, прысвоены ў 1977-м, служыў надзейнай гарантыяй для больш як 200 гандлёвых арганізацый з Масквы, Ленінграда, Сярэдняй Азіі, Прыбалтыкі. Аднак прадпрыемства моцна стрымлівала залежнасць ад завезенага матэрыялу. Таму ў 1981 годзе пачалося будаўніцтва фабрыкі трыкатажнага палатна.

Першы комплекс па вырабе палатна быў уведзены ў дзеянне ў 1985-м, а ўжо ў наступным годзе здалі ў эксплуатацыю другі комплекс — фарбавальна-апрацоўчую вытворчасць. І адразу ж фабрыка стала самастойным суб'ектам гаспадарання — Жодзінскім вытворчым швейна-трыкатажным аб'яднаннем.

На пачатку 1990-х у новых эканамічных умовах патрабавалася хутка рэагаваць на змяненне кан'юнктуры рынку.

У 1991-м аб'яднанне ператварылася ў Жодзінскую прамыслова-гандлёвую фірму «Світанак», а ў 1994-м гэта было ўжо ААТ «Світанак».

Сем чалавек толькі ў адным швейным цэху №2 працуюць, што называецца, ад нараджэння фабрыкі. Швачка Ніна Кірэеўна Лыціна родам з

Магілёўскай вобласці, вучылася ў Віцебскай, а працаваць пачала ў Мінскай. Скончыла дзесяць класаў, прыйшла на жодзінскае прадпрыемства, дзе яе адразу залічылі ў штат і накіравалі ў Віцебск на вучобу будучай спецыяльнасці швачкі. Праз паўгода быў гатовы спецыяліст.

«Мы шылі тады толькі дзіцячы асартымент — паўзункі, фуфаечкі, — кажа Ніна Кірэеўна. — Яшчэ да таго, як сюды ўзялі мяне, тут працаваў слесарам мой будучы муж... Швачкі ўмеюць толькі шыць, а нехта ж павінен наладжваць і рамантаваць нашы машыны... Тут пазнаёміліся, а неўзабаве і стварылі сям'ю. У нас двое дзяцей і трое ўнукаў. Я шыю ўжо і дарослы, і дзіцячы асартымент, а муж па-ранейшаму працуе слесарам».

У старшыні цэхавага камітэта Вольгі Сцяпанаўны Кавалёвай недзе нават захаваліся старыя фота завода. «Цяперашні цэх не пазнаць, — кажа Вольга Сцяпанаўна. — Мяне ў свой час накіравалі з групай іншых дзяўчат вучыцца на паўгода ў Днепрапятроўск. Я добра памятаю, што тут быў толькі адзін корпус, у якім мы з вамі і знаходзімся. Планіроўка была зусім іншая, гэта былі канвееры, а не асобныя працоўныя месцы з машынамі. Нас на той момант было ў цэху 1250 чалавек. Наш цэх шыў ясельны асартымент. Тут жа працавалі і закройшчыкі. Работа ішла ў дзве змены. На канвееры было ўсяго дзве-тры мадэлі, а цяпер асартымент такі, што нашы швачкі здольныя выконваць вельмі вялікі аб'ём розных аперацый на розных машынках. Наша швачка вельмі высока цэніцца на любым швейным прадпрыемстве краіны».

Святлана БАРЫСЕНКА, Вераніка ХІЛЬКЕВІЧ.

УНП 600038919

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Продавец: ОАО «Барановичиметаллопторг» (ликвидационная комиссия). Тел.: (017) 398-24-86; 398-64-33.
Организатор аукциона: ЗАО «Центр промышленной оценки» (г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1703, тел.: (017) 280-36-37)

ЛОТ № 1: имущество, расположенное на земельном участке пл. 0,4034 га, предоставленном продавцу на праве постоянного пользования по адресу: Брестская область, г. Барановичи, ул. Слонимское Шоссе, 18Г, в составе:

Цех услуг (в т.ч. забор, покрытие), общ. пл. 649,6 кв.м, инвентарный номер: 110/С-86090; **Туалет, пл.** 1,5 кв.м, инвентарный номер: 110/С-99715; **Кран подвесной в цехе услуг**, инв. № по бух. учету 4170

Начальная цена с НДС 20% – 580 816 080 бел. руб. (снижена на 70%)

ЛОТ № 2: имущество, расположенное на земельных участках пл. 2,5253 га; пл. 0,0137 га, предоставленных продавцу на праве постоянного пользования по адресу: Брестская область, г. Барановичи, ул. Слонимское Шоссе, 18 В, 18В/2, в составе:

Пост охраны, общ. пл. 7,7 кв.м, инвентарный номер: 110/С-99750. **Открытый склад №1,** общ. пл. 8916,3 кв.м, инвентарный номер: 110/С-62149. Составные части и принадлежности: бетонное покрытие пл. 7730 кв.м; плиточное покрытие пд. 1155 кв.м; забор ж/б, h-2.00., пл. 640 кв.м; подъездной ж/д путь, протяженность 384 м.п.; двое металлических ворот. **Торговые павильоны,** общ. пл. 345,8 кв.м, инвентарный номер: 110/С-100114. **Магазин автозапчастей**, общ. пл. 98,8 кв.м, инвентарный номер: 110/С-86092. **Туалет,** общ. пл. 28,6 кв.м, инвентарный номер: 110/С-99800

Передвижные киоски (3 шт), инв. № по бух. учету 1000020; 1000021; 1000022. **Ворота въездные**, инв. № по бух. учету 10000135. **Заезд на эстакаду**, инв. № по бух. учету 10000146. **Эстакада**, инв. № по бух. учету 10000119. **Шлагбаум** электромеханический X-BAR 01079. инв. № по бух. учету 9169; **Шлагбаум** DITEC, инв. № по бух. учету 9059; **Рекламный щит № 4**, инв. № по бух.учету 10000116; **Рекламный щит № 2**, инв. № по бух. учету 10000114

Начальная цена с НДС 20% – 4 434 994 080 бел. руб. (снижена на 70%)

Шаг аукциона	5 (пять процентов) от начальной цены Лота

Затраты на организацию и проведение аукциона возмещаются организатору аукциона победителем аукциона либо единственным участником аукциона, согласившимся приобрести предмет аукциона (Лот) по начальной цене, увеличенной на 5%, в течение 5 дней со дня проведения торгов. Общая сумма затрат не превышает 14 000 000 белорусских рублей

Срок подписания договора к/продажи	В течение 15 (пятнадцати) рабочих дней с даты проведения аукциона
Срок оплаты предмета аукциона	Не более 30 (тридцати) дней со дня заключения договора купли-продажи

Задаток 10% от начальной цены Лота в белорусских рублях (BYR) перечисляется на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки»

Требования к участникам торгов: лицо, желающее участвовать в торгах, обязано подать организатору торгов в указанный в извещении срок заявление на участие в торгах, документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка. Кроме того, представляются следующие документы: юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь – копии устава (учредительного договора – для коммерческой организации, действующей только на основании учредительного договора), имеющего штамп, свидетельствующий о проведении государственной регистрации, и свидетельства о государственной регистрации и их подлинники для заверения копий организатором аукциона, доверенность представителю юридического лица (если юридическое лицо представляет не руководитель) или документ, подтверждающий полномочия руководителя юридического лица (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор либо иные документы в соответствии с законодательством); юридическим лицом, иной организацией – нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до даты подачи заявления) или иное равнозначное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык, легализованная в установленном порядке доверенность представителю юридического лица, иной организации или другие легализованные в установленном порядке документы с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык; индивидуальным предпринимателем – резидентом Республики Беларусь – копия свидетельства о государственной регистрации и подлинник для заверения копии организатором аукциона; индивидуальным предпринимателем – нерезидентом Республики Беларусь – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык; представителем гражданина Республики Беларусь, индивидуального предпринимателя – резидента Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного физического лица, индивидуального предпринимателя – нерезидента Республики Беларусь – легализованная в установленном порядке доверенность с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов на участие в торгах физическое лицо, индивидуальный предприниматель, представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица, иной организации предъявляют оригинал документа, удостоверяющего личность, и представляют его копию, которая заверяется организатором торгов. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5%

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Рэспубліка» от 14.10.2015

Дата и место проведения аукциона	**12.01.2016 в 14.00, по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 11.01.2016 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки». Тел.: +375 17 280 36 37; 8029-183-69-71. www.cpo.by. E-mail: auction@cpo.by

Дополнительная информация по Лоту № 2:
Целевое назначение земельных участков пл. 2,5253 га, 0,0137 га, предоставленных продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания зданий и сооружений авторынка, не подлежит изменению до организации в г. Барановичи нового автомобильного рынка, срок создания которого составляет 4 года

Иные сведения: Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица»

СПК «Агрофирма «Лучники» извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже объекта недвижимости:

ЗДАНИЕ КОРОВНИКА,

расположенное по адресу: Минская обл., Слуцкий р/н, Серяжский с/с, д. Павловка, общей площадью – 1404,4 м², инв. №01/502, начальная цена – 4 738 250 белорусских рублей с НДС. Год постройки 1977.

Условия продажи: без условий.
Условия пользования: объект продается в собственность.
Размер задатка для участия в аукционе – 10 % от начальной цены, перечисляется на расчетный счет р/с 30124553110010 РКЦ №42, г. Слуцк, ф-л ОАО «БелАПБ» МОУ г. Минск, код 153001942.
Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней от даты проведения аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.
Объект недвижимости являются собственностью СПК «Агрофирма «Лучники».
Срок подачи заявления на участие в аукционе с момента опубликования **до 10.00 6 января 2016 года** по адресу: Минская обл., Слуцкий р-н, д. Лучники, ул. Цыкова, 5а, каб. №6 (здание администрации).
Дата, время, место проведения аукциона: **11 января 2016 года в 12.00** по адресу: Минская обл., Слуцкий р-н, д. Лучники, ул. Цикова, 5а, актовый зал (здание администрации).
Справки и дополнительная информация по телефону: 801795-96-860, т./ф.: 96-105, 8029-1111220.

УНП 600043549

Технический администратор доменных зон БЕЛ и .BY ООО «НАДЕЖНЫЕ ПРОГРАММЫ»
сообщает о проведении благотворительных аукционов на регистрацию доменных имен, исключенных из реестра.

Средства от аукциона, кроме стоимости услуг по регистрации доменного имени и налогов, будут перечислены на нужды детей-сирот и детей, оставшихся без попечения родителей.

Предметом аукциона являются доменные имена в доменных зонах БЕЛ и .BY, исключенные из реестра. Перечень доменных имен, предлагаемых к регистрации по результатам аукциона, размещается на сайте https://auction.cctld.by.
Даты проведения аукционов в период с января по июнь 2016 г.:
Дата начала январского аукциона доменов – 11 января 2016 г., дата окончания аукциона – 13 января 2016 г.
Дата начала февральского аукциона доменов – 08 февраля 2016 г., дата окончания аукциона – 10 февраля 2016 г.
Дата начала мартовского аукциона доменов – 14 марта 2016 г., дата окончания аукциона – 16 марта 2016 г.
Дата начала апрельского аукциона доменов – 11 апреля 2016 г., дата окончания аукциона – 13 апреля 2016 г.
Дата начала майского аукциона доменов – 16 мая 2016 г., дата окончания аукциона – 18 мая 2016 г.
Дата начала июньского аукциона доменов – 13 июня 2016 г., дата окончания аукциона – 15 июня 2016 г.
Время начала аукциона – 12.00 часов даты начала аукциона, время окончания аукциона – 12.00 часов даты окончания аукциона. В случае, если в течение последних 2 минут до окончания аукциона была сделана ставка, срок проведения аукциона автоматически продлевается еще на 5 минут.
Аукцион проводится на интернет-ресурсе http://auction.cctld.by.
В отношении каждого доменного имени, являющегося предметом аукциона, размещается программная форма, позволяющая участникам аукциона делать ставки.
Участниками аукциона могут быть юридические и физические лица, в том числе индивидуальные предприниматели, являющиеся резидентами или нерезидентами Республики Беларусь. Для участия в аукционе участник должен пройти регистрацию на сайте http://auction.cctld.by
Прием ставок прекращается по истечении 2 календарных дней после начала аукциона по каждому доменному имени.
Аукцион считается состоявшимся при наличии хотя бы одной ставки.
Победившим в аукционе считается тот участник, который сделал максимальную ставку к моменту окончания аукциона.
Текст Положения о порядке проведения аукциона на регистрацию доменных имен находится на сайте http://auction.cctld.by в разделе «Правила проведения аукционов»
Организатор аукциона: ООО «НАДЕЖНЫЕ ПРОГРАММЫ», УНП 100160363, e-mail: au@hoster.by
Тел. организатора +375 17 239 57 02.
Тел. комиссии по организации и проведению аукциона +375 17 239 57 77.

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки», 220113, г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1703**
Продавец	**ОАО «Трест Белтрансстрой», 220050, г. Минск, ул. Советская, 8**

Предмет аукциона

Наименование	Назначение	Общая площадь (кв.м)	Инвентарный номер	Адрес
Котельная	Здание специализированное коммунального хозяйства	488	100/С-47321	г. Брест, ул. Карасёва, 100/2

Составные части и принадлежности: два забора, навес для хранения дров, площадка для хранения дров, дворовое покрытие, бордюр дорожный, бордюр тротуарный, мачта освещения

Дополнительная информация: в соответствии с решением Брестского горисполкома продавцу разрешено изменить и зарегистрировать в установленном порядке целевое назначение предмета аукциона и использовать его как **здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ (код 2 29 08).** Оборудование котельной демонтировано

Начальная цена предмета аукциона с НДС 20% – 1 825 653 600 бел. руб.

Сведения о земельном участке и сроках подписания договора купли-продажи: предмет аукциона расположен на земельном участке пл. **2,3253 га,** предоставленном продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания производственной базы. Продавец в зависимости от количества реализованных лотов, расположенных на территории производственной базы, в установленном законодательством порядке после проведения аукциона обращается за осуществлением регистрационных действий в отношении земельного участка, необходимого для обслуживания предмета аукциона. После выделения самостоятельного земельного участка для обслуживания предмета аукциона между продавцом и покупателем в течение 5 (пяти) рабочих дней после получения продавцом свидетельства о государственной регистрации земельного участка должен быть подписан договор купли-продажи

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (BYR) перечисляется на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в евро (EUR) – 3012343265060; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Оплата за предмет аукциона производится в порядке, установленном в договоре купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

Дата и время проведения аукциона	**12.01.2016 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Советская, 8, ОАО «Трест Белтрансстрой»**
Дата и время окончания приема документов	**11.01.2016 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Контактные телефоны	**Тел: +375 17-280-36-37; +375 29-183-69-71; auction@cpo.by; www.cpo.by**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Мозырский нефтеперерабатывающий завод» (продавец)

проводит открытый аукцион по продаже

четырехкомнатной квартиры,

инв. № 500/D-85663, общей площадью 93,3 кв.м, расположенной по адресу: г. Минск, ул. Кирова, дом 2, квартира 24.

Начальная цена без НДС – 115 000 условных единиц (долларов США). Задаток 10% от начальной цены (208 000 500 бел. руб.).

Стоимость Объекта, установленную в долларах США, покупатель оплачивает в белорусских рублях по официальному курсу Национального банка Республики Беларусь на день перечисления денежных средств на счет продавца.
Помещение является памятником историко-культурного наследия. При приобретении права собственности на материальную историко-культурную ценность новый собственник обязан в течение одного месяца подписать охранное обязательство.
Задатки перечисляются на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».
Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона в размере 2 (двух) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона. Вознаграждение за организацию и проведение аукциона оплачивается в белорусских рублях по курсу Национального банка на день перечисления денежных средств на счет организатора аукциона.
Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 11.11.2015.
Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**
Аукцион состоится **22.12.2015** в **10.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **22.12.2015** до **16.00** по указанному адресу.
Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.

---

21 декабря 2015 года в 11.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Брестская трикотажная фирма «Элма».
ПОВЕСТКА ДНЯ:
1. О сделках Общества.
Местонахождение ОАО: г. Брест, ул. Куйбышева, 13.
Место проведения собрания: г. Брест, ул. Куйбышева, 13 (кабинет директора).
С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Брест, ул. Куйбышева, 13 с 16 декабря 2015 года по 18 декабря 2015 года с 9.00 до 16.00 либо 21 декабря 2015 года по месту проведения собрания.
Начало регистрации участников собрания: 10.30.
При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).

УНП 200295587 Совет директоров.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению РУП «БЕЛФАРМАЦИЯ» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже

ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ИЗОЛИРОВАННОГО ПОМЕЩЕНИЯ АДМИНИСТРАТИВНОГО НАЗНАЧЕНИЯ

площадью 82,9 кв.м, расположенного по адресу: г. Минск, ул. Крупской, 17, пом. 39, для использования под офис (далее – объект)

	Описание
Срок договора аренды	5 лет
Начальная цена права заключения договора аренды объекта	2 487 000 бел. руб.
Сумма задатка	248 700 бел. руб.
Шаг аукциона	15%
Размер ежемесячной арендной платы за сдачу в аренду	11 937 600 бел. руб.
Условия (при их наличии) продажи Объекта аукциона	уборка прилегающей территории

Базовая арендная величина с 01.04.2015 составляет 120 000 бел. руб. В соответствии с подпунктом 2.1 пункта 2 Указа Президента Республики Беларусь от 29.03.2012 № 150 «О некоторых вопросах аренды и безвозмездного пользования имуществом» размер базовой арендной величины ежегодно устанавливается Советом Министров Республики Беларусь с учетом изменения индекса потребительских цен за предыдущий год по отношению к предшествующему и применяется с 1 апреля года, в котором он установлен.
Задаток 10% от начальной цены (248 700 бел. руб.), перечисляется на р/с № 3012108260016; в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».
Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан перечислить арендодателю сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение.
Договор аренды имущества должен быть заключен в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.
Порядок проведения аукциона регламентирован Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049, а также иными актами законодательства.
Аукцион состоится **12.01.2016** в **11.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **11.01.2016** до **16.00** по указанному адресу.
Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17, сайт в сети интернет: www.rlt.by.

Извещение о проведении 22 января 2016 г. торгов по продаже имущества, на которое обращено взыскание в счет неисполненного налогового обязательства, неуплаченных пеней

Предмет торгов (наименование, характеристики, местонахождение продаваемого имущества)	Капитальное строение с инвентарным номером 610/С-13049, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 620800000001001757 по адресу: Минская область, Борисовский район, Метченский с/с, 2/25 (Одноэтажное железобетонное, кирпичное здание общей площадью 1494,5 кв.м; наименование: Птичник №4; назначение: Птичник №4)
Местонахождение имущества	Минская обл., Борисовский р-н, Метченский с/с, 2/25
Начальная цена	1 329 243 257 рублей
Сумма задатка	132 924 000 рублей
Организатор аукциона	УП «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, ком. 10
Балансодержатель (должник)	Общество с ограниченной ответственностью «БелВитКорм»

Организатор аукциона – УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.
Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 04.09.2006 № 559, и порядком проведения аукциона, утвержденным организатором аукциона.
К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, представившие организатору аукциона следующие документы:
заявление на участие в аукционе (по форме, определенной организатором аукциона); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, определенной организатором аукциона); копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.
При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.
Задаток перечисляется на расчетный счет №3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369; получатель – УП «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583. Сумма задатка для участия в аукционе должна быть внесена в срок, установленный для приема документов.
Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем аукциона, наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона.
Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона. Информация о размере затрат доводится до сведения участников перед началом аукциона.
Аукцион проводится 22 января 2016 г. в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.
Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 10.12.2015 по 19.01.2016** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.
Телефоны для справок: (017) 327-40-22, (017) 327-48-36 – УП «Минский городской центр недвижимости».

ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ ООО «Датч Стар»,

опубликованной в газете «Звязда 26.09.2013 г. № 181,
строительства многоквартирного жилого дома с подземной гараж-стоянкой
(№ 1 по генеральному плану в квартале пр. Дзержинского – ул. Щорса – ул. Железнодорожная – ул. Хмелевского)
со встроенными объектами обслуживания населения:
«...Стоимость 1 кв.м для граждан, не нуждающихся в улучшении жилищных условий, квартир, площадью **89,87 кв.м**, на 18 этаже – **1300 (одна тысяча триста) долларов США**, площадью **71,82 кв.м** на 8 этаже – **1250 (одна тысяча двести пятьдесят) долларов США».**
Дополнительную информацию можно получить по адресу: г. Минск, ул. Немига, 40, офис 704.
Тел.: 8 (017) 306 20 90, Vel.: 8 (029) 380 26 80, 8 (044) 781 81 17.

УНП 191061436

УП «Забудова-Автотранс» (организатор аукциона) извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества

Лот	Автобус вагон NEOPLAN N121HD/P14, кузов (VIN) №WAGP14ZZ374001635, 2007 г.в.	Начальная цена с НДС, бел. рублей	Задаток с НДС, бел. рублей	Шаг аукциона, %
		1 837 200 000	18 372 000	5

УСЛОВИЯ

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Лот по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов) – Претендент на покупку, должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Лота в течение 10 (десяти) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
Валюта торгов – белорусский рубль. Валюта платежа – белорусский рубль.
Сумма для оплаты задатка за участие в аукционе производится в белорусских рублях.
Условия оплаты приобретенного на аукционе Лота согласовываются Победителем аукциона (Претендентом на покупку) и Продавцом при заключении договора купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения аукциона.
Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

Аукцион состоится 12.01.2016 в 11.00 по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, п. Чисть, ул. Заводская, 4

Заявки на участие в аукционе принимаются в рабочие дни **с 10.12.2015 по 05.01.2016.**
Документы, необходимые для участия в торгах – заявление на участие в аукционе; платежный документ с отметкой банка о внесении задатка; копии документов, подтверждающих юридические полномочия участника торгов (его представителя). Необходимые документы должны быть представлены по адресу: **Минская обл., Молодечненский р-н, п. Чисть, ул. Заводская, 4 не позднее 16 часов 00 минут 05 января 2016 г.**
Для участия в торгах лицо, заявившее о своем участии в торгах, вносит задаток в счет обеспечения оплаты приобретаемого на торгах имущества в размере 1 процента от начальной цены имущества, выставляемого на торги.
Задаток перечисляется на следующие реквизиты: р/с 3012164225082 в ОАО «Банк БелВЭБ», код 226. Получатель – УП «Забудова-Автотранс», УНП 600468334.
Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие в них.
Победителем признается участник, предложивший наибольшую цену.
Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов согласно действующему законодательству.
Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом аукциона. Контактное лицо для осмотра Объекта: Найденков Павел Николаевич, 8 (029) 8770113.
Более подробную информацию можно получить у Организатора аукциона.

☎ Организатор: 8 (0176) 724 711, 8 (017) 395 81 34

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА (ПОНИЖЕНИЕ ЦЕНЫ НА 80%) ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «МОСТОВДРЕВ»

Предмет торгов, краткая характеристика	**Лот №1**		
	Капитальное строение с инв. № 412/С-25446 (овощехранилище) общей площадью 303,8 кв.м, кирпичное, одноэтажное, 1976 г.п.		
Сведения о земельном участке	Кадастровый номер 424050100015000018, площадь 0,0433 га, назначение – размещение промышленных объектов		
Местонахождение имущества	Гродненская обл., Мостовский р-н, г. Мосты, ул. Пушкина, д. 25		
Начальная цена	**37 092 770 рублей с учетом НДС**	**Задаток (10%)**	**3 709 300 рублей**
Сведения о продавце	ОАО «Мостовдрев», Гродненская обл., г. Мосты, ул. Советская, 38, тел. 8(01515) 3 36 63		
Сведения об организаторе торгов и номер счета для перечисления задатка	Гродненское областное учреждение финансовой поддержки предпринимателей, г. Гродно, ул. Мицкевича, 8, тел. 8(0152) 74 49 11, р/с 3015575033025 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской обл., г. Гродно, ул. Мицкевича, 3, код 739, УНП 500481906		
Срок заключения договора купли-продажи	В течение 20 рабочих дней с даты подписания протокола о проведении торгов	**Условия оплаты**	Определяются по согласованию сторон
Торги состоятся 21 декабря 2015 года в 12.00 часов по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8			
Срок подачи документов	**по 15 декабря 2015 года включительно до 16.00 часов по адресу: г. Гродно ул. Мицкевича, 8**		
Условия участия и порядок проведения аукциона размещены на сайте организатора торгов www.fincentr.by			
Дополнительная информация по тел. в г. Гродно: 8(0152) 74 49 11	Предыдущие публикации: газета «Звязда» от 09.09.2015 г., от 29.10.2015 г., 19.11.2015 г.		

белагропромбанк
традиции будущего

КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 октября 2015 г.

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «Белагропромбанк»

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	2015 год	2014 год
1	2	3	4	5	6
1	**АКТИВЫ**				
2	Денежные средства	1101		1 287 167	1 279 558
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102		3 280	5 996
4	Средства в Национальном банке	1103		7 274 646	5 499 798
5	Средства в банках	1104		1 138 268	572 742
6	Ценные бумаги	1105		14 666 225	10 514 130
7	Кредиты клиентам	1106		63 469 875	55 039 528
8	Производные финансовые активы	1107		-	1 748
9	Инвестиции в зависимые юридические лица			-	-
10	Инвестиции в совместно контролируемые юридические лица			-	-
11	Долгосрочные финансовые вложения	1108		270 425	248 685
12	Основные средства и нематериальные активы	1109		3 999 958	3 743 235
13	Имущество, предназначенное для продажи	1110		70 006	570
14	Отложенные налоговые активы	1111		-	-
15	Деловая репутация			-	-
16	Прочие активы	1112		1 690 790	1 750 458
17	ИТОГО активы	11		93 870 640	78 656 448
18	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**				
19	Средства Национального банка	1201		5 386 225	4 528 310
20	Средства банков	1202		12 619 537	8 737 104
21	Средства клиентов	1203		55 165 116	47 519 712
22	Ценные бумаги, выпущенные банком	1204		6 324 484	5 253 217
23	Производные финансовые обязательства	1205		2 713	15 204
24	Отложенные налоговые обязательства	1206		12	11
25	Прочие обязательства	1207		822 903	679 209
26	ВСЕГО обязательства	120		80 320 990	66 732 767
27	**СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ**				
28	Уставный фонд	1211		8 103 591	6 803 591
29	Эмиссионный доход	1212		-	-
30	Резервный фонд	1213		984 453	938 824
31	Фонды переоценки статей баланса	1214		1 559 074	1 540 353
32	Накопленная прибыль	1215		2 792 347	2 538 773
33	Всего собственный капитал, принадлежащий головной организации			13 439 465	11 821 541
34	Доля неконтролирующих акционеров			110 185	102 140
35	ВСЕГО собственный капитал	121		13 549 650	11 923 681
36	ИТОГО обязательства и собственный капитал	12		93 870 640	78 656 448

КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ о прибылях и убытках за январь–сентябрь 2015 года

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «Белагропромбанк»

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	2015 год	2014 год
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011		8 475 900	6 985 616
2	Процентные расходы	2012		7 166 481	5 404 307
3	Чистые процентные доходы	201		1 309 419	1 581 309
4	Комиссионные доходы	2021		881 499	816 186
5	Комиссионные расходы	2022		185 368	171 872
6	Чистые комиссионные доходы	202		696 131	644 314
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203		1 991	215
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204		(14 569)	(4 978)
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205		516 794	302 044
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206		72 496	6 221
11	Чистые отчисления в резервы	207		781 012	421 343
12	Прочие доходы	208		909 413	1 083 440
13	Операционные расходы	209		1 923 931	1 912 062
14	Прочие расходы	210		238 530	198 158
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211		548 202	1 081 002
16	Расход (доход) по налогу на прибыль	212		194 440	246 816
17	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2		353 762	834 186
18	Доля в прибыли (убытке) зависимых юридических лиц			-	-
19	Доля в прибыли (убытке) совместно контролируемых юридических лиц			-	-
20	ИТОГО ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)			353 762	834 186
21	До

■ А вы ведалі?

РУБЕЛЬ ПАЙШОЎ АД ГРЫЎНІ,

або Што можна назваць старажытным «аналагам» долара?

Налета ў нашай краіне ўпершыню за часы дзяржаўнай незалежнасці ў абарот будуць уведзены манеты. Карэспандэнт «Звязды» пацікавіўся ў музейшчыкаў, якія металічныя грошы мелі хаджэнне калісьці на тэрыторыі сучаснай Беларусі. Мне паказалі манетныя скарбы. Аказваецца, быў у нас час, калі (як і сёння) манеты не выкарыстоўваліся. Цікава было пачуць і пра распаўсюджанасць арабскіх манет. І пра тое, што раней падчас фінансавых крызісаў «уключалі друкарскі станок»...

З калекцыі Віцебскага краязначага музея.

5 капеек (сібірская манета). Расійская імперыя, 1778 г.

Сестэрцый. Рымская імперыя, 246-249 гг.

1 дэсім 4-га года рэвалюцыі. Францыя, 1795-1796 гг.

1 шылінг. Вольны горад Рыга, 1575 г.

— Гісторыю «манетнай тэмы» цікава вывучаць праз «прызму» скарбаў. У нашым музеі багатая калекцыя знойдзенага на тэрыторыі Віцебшчыны. Выстава ўсё больш папулярная сярод наведвальнікаў музея, напярэдадні хуткай перспектывы карыстацца манетамі людзям цікава, якія калісьці былі манеты, — распавядае **Валерый ШЫШАНАЎ, намеснік дырэктара Віцебскага абласнога краязнаўчага музея па навуковай рабоце**. — У IX-X стагоддзях, мяркуючы па скарбе, які школьнікі ў савецкі час знайшлі ў Лёзненскім раёне, у нас былі вельмі распаўсюджаны арабскія дырхамы. Манетныя двары знаходзіліся на тэрыторыі сучаснага Туніса, Ірака і Ірана, Узбекістана (у Ташкенце і Самаркандзе. — **Аўт.**). Гэта тлумачыцца проста: у краінах Арабскага халіфата тады здабывалася шмат срэбра і вялася актыўная чаканка манет. А ў Еўропе быў дэфіцыт каштоўных металаў. Таму і выкарыстоўваліся арабскія грошы. Адпаведныя скарбы былі знойдзены на берагах Заходняй Дзвіны, Дняпра — на гандлёвых шляхах. Дарэчы, чым пазней, тым проба манет была ніжэйшай, аж да медных даходзіла... Калі на Усходзе запасы срэбра вычарпаліся, быў так званы безманетны перыяд — прыкладна ў XI-XII стагоддзях. А на Русі тады грашыма былі кавалачкі скуры, а таксама сярэбраныя зліткі — грыўні. У XIII стагоддзі для наўгародскіх грыўняў стала ўжывацца найменне «рубель». Яно паступова «выцесніла» назву «грыўня». У XV стагоддзі зліткі «грыўня» і «рубель» перасталі быць грашова-аплатнымі сродкамі. Пры гэтым назва «рубель» засталася і перайшла на асноўную адзінку рускай манетнай сістэмы. Грыўні адрозніваліся па вонкавым выглядзе і вазе, і ў залежнасці ад рэгіёна, былі кіеўскія, наўгародскія, літоўскія (заходнярускія)... Апошнія — зліткі серабра ў выглядзе палачак з адной або некалькімі ўвагнутасцямі на спінцы. Памеры такіх грошай ад 10-17 сантыметраў, а вага — 100-105 грамаў. У летапісных крыніцах манета называецца грыўняй, або ізрой. Чаканка ўласных манет (залатыя (златнікі) і сярэбраныя (сярэбранікі)) у Кіеўскай Русі пачалася пры князі Уладзіміры. Але яны вельмі рэдкія і ў экспазіцыі не прадстаўлены.

«У IX-X стагоддзях у нас былі вельмі распаўсюджаны арабскія дырхамы. Манетныя двары знаходзіліся на тэрыторыі сучаснага Туніса, Ірака і Ірана, Узбекістана».

Асаблівасцю грашовага абароту Вялікага Княства Літоўскага, у тым ліку і на тэрыторыі сучаснай Беларусі, з'яўлялася выкарыстанне чужых чаканных манет, што прымушала шукаць усё новыя рынкі для іх набыцця. Гэта было прыкладна ў 1300—1492 гадах. І ў грашовым абароце ВКЛ названа «перыядам пражскага гроша» — у гонар найбольш распаўсюджанай манеты... Калі ў Чэхіі былі знойдзены вялікія запасы срэбра, чэшскія каралі чаканілі досыць вялікую манету — грош. У экспазіцыі прадстаўлены скарб, які быў знойдзены ў 1968 годзе на балоце каля вёскі Зарэчча Віцебскага раёна. У музеі захоўваецца каля 80 манет — пражскія грошы праўлення Вацлава IV (1378—1419).

Па меры павелічэння здабычы срэбра і развіцця вытворчасці з'явілася магчымасць чаканіць буйныя сярэбраныя манеты. І яны сведчаць пра высокае развіццё тэхналогіі і медальернага мастацтва.

— У 1510-1512 гадах у вобласці Рудных гор на паўночным усходзе Багеміі адкрыты багатыя радовішчы серабра. Па загадзе мясцовага кіраўніка Стэфана Шліка ў 1516 годзе быў заснаваны пасёлак рудакопаў, які атрымаў назву Таль (ад нямецкага слова «tal» — даліна). У 1517 годзе населены пункт, які стаў даволі буйным, у гонар заступніка рудакопаў святога Яўхіма атрымаў назву Яўхімсталь. Адсюль пайшла назва буйной сярэбранай манеты талера. І манеты такога тыпу дамінавалі ў XVI—XIX стагоддзях і адыгрывалі важную ролю ў грашовым абароце Еўропы і ў міжнародным гандлі. Значнае распаўсюджанне, у тым ліку і на нашых землях, яны атрымалі ў XVI—XVIII стагоддзях. У віцебскай экспазіцыі прадстаўлены талер Усходняй Фрызіі, патагоны Іспанскіх Нідэрландаў, левендаальдары і сярэбраныя дукаты Галандскай Рэспублікі.

У Польшчы і Вялікім Княстве Літоўскім беднякі карысталіся грошамі і 1,5-грошамі, солідамі — такія манеты ў вялікай колькасці знаходзяцца ў скарбах.

— У XVII стагоддзі адбыўся фінансавы крызіс. І ў Рэчы Паспалітай манеты пачалі вырабляць, можна так сказаць, «меншага сабекошту» — медныя соліды («барацінкі»). Верагодна, разлічваючы, што народ усё роўна будзе карыстацца імі. Манеты выраблялі ў велізарнай колькасці. Як сёння сказалі б, уключалі «друкарскі станок». У выніку пачыналася інфляцыя, былі высокімі цэны. Назіралася і расстройства грашовага абароту. Так, гэта «вечнае пытанне». У прынцыпе, у эканоміцы, можна сказаць, нічога не змяняецца, — працягнуў навуковец.

«Калі на Усходзе запасы срэбра вычарпаліся, быў так званы безманетны перыяд — прыкладна ў XI-XII стагоддзях. А на Русі тады грашыма былі кавалачкі скуры, а таксама сярэбраныя зліткі — грыўні».

У адрозненне ад Еўропы, у Расіі доўгі час не было сваіх запасаў серабра. Таму замежныя манеты — з Германіі, Галандыі, Іспаніі — выкарыстоўваліся для чаканкі рускіх капеек. Іх пераплаўлялі або рабілі «дрот» для перапрацоўкі: секлі на часткі і чаканілі. Такія манеты Пётр I называў луской...

Пачынаючы з часу праўлення Пятра I, у Расіі разам з сярэбранай манетай ужо еўрапейскага тыпу ў велізарнай колькасці чаканіцца медная — палова капейкі (дзяньга), 1,2, 3 і 5 капеек. Яны таксама ў вялікай колькасці знаходзяцца ў скарбах. Апошнія скарбы — гонар віцебскага музея. Тут можна ўбачыць і карты з указаннем месцаў, дзе яны былі знойдзены. Прадстаўлены прадметы, куды хавалі грошы: манеты — у кераміку, папяровыя грошы — у бутэлькі. Ёсць скарб часоў вайны 1812 года, а побач — аўтэнтычная форма напалеонаўскага салдата.

У 1995 годзе на тэрыторыі прадпрыемства «Хімпласт» у райцэнтры Гарадок быў знойдзены скарб з сярэбранымі сталовымі прыборамі, залатымі ўпрыгажэннямі і сярэбранымі манетамі. Ён, верагодна, быў закапаны ў перыяд рэвалюцыі і грамадзянскай вайны.

Для зручнасці агляду на выставе ёсць інтэрактыўнае прыстасаванне. Можна націснуць, напрыклад, на карту — і на вялікім экране на сцяне з'явіцца павялічаная выява манеты, якая вас зацікавіла.

Нашы продкі хавалі і посуд. Параўнальна нядаўняя знаходка — скарб у Віцебску. Пры будаўніцтве новага будынка КДБ адкапалі часткі шабляў, знакі адрознення дарэвалюцыйнага і паслярэвалюцыйнага часоў. Не так даўно, калі будавалі банк на вуліцы Леніна, знайшлі сталовы сервіз прыкладна 1930-х гадоў вырабу.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
pukshanski@zviazda.by

Даты Падзеі Людзі

9 СНЕЖНЯ

1805 год — 210 гадоў таму нарадзіўся (вёска Нагародавічы, цяпер Дзятлаўскі раён) Вікенцій Дмахоўскі, жывапісец. Заснавальнік беларускага пейзажнага жывапісу. Вучыўся ў Віленскім універсітэце, адначасова займаўся жывапісам у Я. Рустэма. У 1831–1837 гадах быў у эміграцыі. Потым жыў у Вільні, у 1855–1858-м — у вёсцы Брацянка каля Навагрудка. Аўтар паэтычных, эмацыйна насычаных, строгіх па кампазіцыі пейзажаў: «Рака Нерыс каля Верак», «Радзіма», «Пажар у лесе», «На начлезе», гістарычнай кампазіцыі «Крыжаносцы пры аблозе крэпасці Пуня» і інш. У 1850–1854 гадах афармляў спектаклі ў Віленскім гарадскім тэатры. Памёр у 1862 годзе.



1842 год — нарадзіўся Пётр Крапоткін, рускі анархіст, географ, гісторык. Яго бацька быў генералам. Хлопчык скончыў Маскоўскую гімназію і Пажскі корпус. У 1862 годзе ў званні афіцэра Крапоткін добраахвотна ідзе ў войска і служыць у Сібіры, у Амурскім казацкім войску. Па службе Пятру Аляксеевічу даводзіцца шмат раз'язджаць па Усходняй Сібіры, ён збірае геаграфічныя і этнаграфічныя матэрыялы. Свае назіранні Крапоткін публікуе ў выглядзе нататак у газетах. У 1867 годзе Пётр Крапоткін звальняецца з ваеннай службы і пераязджае з сям'ёй у Пецярбург. Тут ён узяўся за вучобу на фізіка-матэматычным факультэце Санкт-Пецярбургскага Імператарскага ўніверсітэта і адначасова пачаў працаваць у Міністэрстве ўнутраных спраў, у аддзеле статыстыкі. Крапоткін працягнуў апрацоўваць свае геаграфічныя матэрыялы. Неўзабаве ён становіцца членам Рускага геаграфічнага таварыства. Сваім галоўным укладам у навуку Крапоткін называў стварэнне атласа горнай Азіі. У 1872-м географ едзе ў Еўропу і ўступае ў Юрскую федэрацыю Першага Інтэрнацыяналу. Адначасова з геаграфічнай дзейнасцю пачынае займацца палітыкай, вядзе рэвалюцыйную агітацыю. Бліскучыя заслугі Крапоткіна ў галіне навукі не выратавалі яго ад арышту за прыналежнасць да рэвалюцыянераў. Зрэшты, у зняволенні яму стварылі ўмовы для працы. Тут ён напісаў сваю кнігу «Даследаванні аб Ледніковым перыядзе». Праз два гады Крапоткін збег з турмы і з краіны. Да рэвалюцыі 1917 года ён пражыў у Еўропе. Пасля яе Крапоткін вярнуўся ў Расію. Ён адмовіўся ад прапановы Керанскага стаць міністрам, а таксама і ад усіх прапанаваных яму прывілеяў. Пажылы анархіст Пётр Аляксеевіч Крапоткін пасяліўся ў Дзмітраве, дзе і памёр у лютым 1921 года.

1968 год — дзень нараджэння камп'ютарнай мышы. Менавіта ў гэты дзень амерыканскі вынаходнік Дуглас Энгельбарт са Стэнфардскага даследчага інстытута на канферэнцыі па вылічальнай тэхніцы ў Сан-Францыска прадэманстраваў у рабоце першую ў свеце камп'ютарную мыш. Гэтая вынаходка ўяўляла з сябе драўляны куб на кольцах з адной кнопкай. Сваім імем мышка абавязана праваду — ён нагадваў вынаходніку хвост сапраўднай мышы. У пачатку 1970-х гадоў кампанія Xerox упершыню прадставіла мыш як частку персанальнага камп'ютара. Яна каштавала 400 долараў!

Было сказана

Георгій МАРЧУК, пісьменнік:

«Калі няма часу думаць пра шчасце — гэта і ёсць шчасце».

Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

ДЗЕ ЗІМУЮЦЬ ШКОДНІКІ?

Пачалася зіма... Здавалася б, можна расслабіцца і адпачыць у нецярплівым чаканні новага сезона. Але гэта памылка! Калі сад і агарод спакойна спяць, недзе дрэмлюць і іх шматлікія шкоднікі, разбуральныя вынікі дзейнасці якіх стануць відаць толькі з прыходам вясны.

На кары яблыні і яе галінах зімуюць залатагузкі, а пад карой — вусені яблыневай пладажэркі.

Што мы можам сёння рабіць? Дзе зімуюць садовыя і агародныя шкоднікі? І галоўнае — як іх абясшкодзіць? Звычайна актыўную барацьбу са шматлікімі шкоднікамі саду і агарода мы пачынаем у пачатку лета — калі вынікі іх дзейнасці відавочныя. І робім тым самым велізарную памылку! Пачынаць барацьбу неабходна нашмат раней. Дзякуючы таму, што надвор'е апошнія некалькі гадоў няўстойлівае (прычым незалежна ад пары года), знішчаць шкоднікаў саду і агарода вельмі зручна менавіта зімой. Ну што, прыступім?

Абследуйце дрэвы ў садзе

Паглядзіце ўважліва на дрэвы ў сваім садзе. Бачыце на некаторых з іх камячкі лісця, якое не абляцела, аблытаныя ледзь прыкметнай павуцінкай? Думаеце, гэта выпадковасць і лісточкі проста вельмі моцна трымаюцца за галінку? Або ў гэтых лісточках жыве маленькі бяскрыўдны павучок? А вось і не! Менавіта ў такім імправізаваным прытулку пасяліўся злосны вораг вашага саду — бялян жылкаваты. Абясшкодзьце яго, пакуль ён спіць, — страсіце такія лісточкі з дрэў і спаліце іх.

Уважліва агледзьце кару дрэў, асабліва калі ўвосень вы не паспелі апрацаваць яе медным купарвасам і пабяліць. Так, напрыклад, на кары яблыні і яе галінах зімуюць залатагузкі, а пад карой — вусені яблыневай пладажэркі. Каб абясшкодзіць залатагузку, зрэжце яе трывала прымацаваныя гнёзды разам з галінкай звычайным секатарам. Улічыце: валасінкі вусеня залатагузкі ядавітыя, таму, знішчаючы гнёзды шкодніка, заўсёды надзявайце пальчаткі.

Справіцца з вусенямі яблыневай пладажэркі таксама нескладана. Узімку ім, на жаль, вы ўжо нічога не зробіце — змагацца з імі можна будзе толькі з прыходам вясны: пабяліце дрэвы і замацуйце на іх спецыяльныя лоўчыя паясы, вырабленыя з кардону, шчыльнай паперы або мешкавіны.

Яблыневы кветаед, які схаваўся на зімоўку ў верхнім слоі глебы пад яблыняй, можа быць знішчаны менавіта зімой.

На кары дрэў каля пупышак і ў развілках галін можна ўбачыць кладкі яек разнастайных кляшчоў і насякомых: чырвонага яблыневага кляшча, зімняга пядзеніка і іншых. Яны могуць быць рознымі па колеры — гэта залежыць ад віду шкодніка. Каб знішчыць гэтыя кладкі, саскрабіце іх нажом або любым вострым прадметам.

На маладзенькіх парастках яблыні любяць уладкоўвацца на зімоўку яблыневая тля і медзяніцы. Выявіць іх досыць лёгка: прыгледзьцеся да кары галінак больш уважліва — на ёй даволі добра прыкметныя невялікія (каля 2,5 мм) бліскучыя чорныя яйкі яблыневай тлі і зусім маленечкія — усяго каля 1 мм у дыяметры — ярка-аранжавыя яйкі медзяніцы, якія мацуюцца да кары дрэва з дапамогай маленькіх атожылкаў. Барацьбу з гэтымі шкоднікамі трэба праводзіць у канцы зімы, калі зіма цёплая, ці вясной, але ў любым выпадку — да распускання пупышак. Для гэтага шчодра апырскайце месцы навалы яблыневай тлі і медзяніцы растворам нітрафену.

Узрыхліце глебу

Многія ворагі саду зімуюць у глебе. Напрыклад, яблыневы кветаед, які схаваўся на зімоўку ў верхнім слоі глебы проста пад яблыняй, можа быць знішчаны менавіта зімой. Для гэтага выберыце час, калі глеба вакол дрэва трохі адтае, і неглыбока ўзрыхліце яе. У выніку такіх нескладаных маніпуляцый шкоднік загіне, як толькі наступіць мароз. Калі ёсць магчымасць, узрыхліце зямлю падчас адлігі і ў маліннік — так вы знішчыце даўганосіка.

Глыбока ў зямлі ўладкаваліся на зіму і крыжакветныя блошкі. Зноў жа, знішчыць у мароз іх не атрымаецца, але, як толькі пацяплее, вы зможаце іх абясшкодзіць. Справа ў тым, што з прыходам нават першага, яшчэ няўстойлівага, цяпла крыжакветныя блошкі выбіраюцца са сваіх земляных сховішчаў вонкі. Першы час, пакуль на градках яшчэ не з'явіліся далікатныя лісточкі расады капусты, яны з задаваленнем сілкуюцца раслінамі стрэлак, якія паспяхова перазімавалі. Знішчыўшы гэтае пустазелле, вы пазбавіцеся ад крыжакветных блошак, папросту пакінуўшы іх без ежы.

Таксама ў зямлі — у прыствольных кругах — зімуюць агрэставая і парэчкавая агнёўкі, большую частку якіх можна знішчыць з дапамогай мульчы з неперапрэлага гною. Дастаткова раскласці слой мульчы таўшчынёй у 5 см, які і закрые шкоднікам вясной шлях на «свежае паветра».

З прыходам цяпла спрактыкаваныя садоўнікі рэкамендуюць правесці яшчэ адну працэдуру, якая пазбавіць ад шматлікіх садовых шкоднікаў, якія зімуюць у глебе вакол дрэў. Заключаецца яна ў наступным: вазьміце паласу звычайнага руберойду шырынёй прыкладна 30 см і накрыйце ім прыствольныя кругі. Прыбраць рубероід можна будзе пасля таго, як сад адцвіце.

Прыбярыце апалую лістоту

Калі з восені па якіх-небудзь прычынах вы не прыбралі апалае лісце ў садзе, улічыце: менавіта ў ім захоўваюцца на працягу ўсёй зімы ўзбуджальнікі такіх распаўсюджаных і небяспечных грыбных хвароб, як септарыёз і антракноз агрэсту і парэчак, парша грушы і яблыні. Акрамя таго, менавіта ў лістоце, якая апала, хаваюцца зімой жукі-даўганосікі і павуцінныя кляшчы. Менавіта таму, як толькі выдаецца такая магчымасць, прыбярыце лістоту з саду, выкарыстоўваючы яе, напрыклад, для кампосту.

Вазьміце ў саюзнікі птушак

Вопыт шматлікіх садаводаў сведчыць: якія б захады мы ні прымалі ў барацьбе з шматлікімі шкоднікамі саду і агарода, вынішчыць іх цалкам папросту немагчыма. Вось тут нам на дапамогу прыйдуць птушкі. Бо менавіта яны — найлепшыя саюзнікі ў барацьбе са шкоднікамі. Але перш, чым птушкі паклапоцяцца пра здароўе вашага саду, вам давядзецца паклапаціцца пра іх: развесіць па садзе кармушкі і як мага часцей падсыпаць у іх корм.

Азбука народнай культуры

ад Янкі Крука і Аксаны Катовіч

ЦЯЖКІ ПАНЯДЗЕЛАК. У традыцыйнай культуры ўсходніх славян за першым днём тыдня ўстойліва замацавалася характарыстыка цяжкага, нядобрага, няўдалага і неспрыяльнага: «Панядзелак лічыцца нешчаслівым, нядобрым днём. Хто народзіцца ў гэты дзень, той будзе гультаяваты, хоць і скупы, але бедны, будзе задзірасты, ні з кім у ладу не пражыве».

◈ Панядзелак — мужчынскі дзень, што дапамагае зразумець некаторыя асаблівасці сялянскага гаспадарання. Напрыклад, не пажадана было садзіць курыцу на яйкі, таму што маглі вывесціся адны пеўнікі. І наадварот, гэты дзень лічыўся спрыяльным для пасадкі фасолі, агуркоў і гарбузоў, вечар панядзелка — для квашання капусты. Меркавалі, што ноч з панядзелка на аўторак спрыяе таму, каб у сям'і нарадзіўся хлопчык.

◈ З цягам часу з'явіліся дадатковыя перасцярогі, звязаныя з гэтым днём: не пажадана класціся ў бальніцу (доўга хварэць будзеш), а таксама звяртацца па дапамогу да знахараў, распачынаць лячэнне цяжкіх або даўніх захворванняў.

◈ На гэтым жа прынцыпе трымаецца і агульнавядомая выснова, сфармуляваная ў прыказцы: «У панядзелак нават цыган у дарогу не збіраецца, бо не пашанцуе». Калі ж гаворка ідзе пра селяніна-земляроба, які «прыкіпеў» да свайго двара і пакідае яго, толькі калі трэба трапіць на кірмаш, гэтая перасцярога набывае характар табу.

◈ Разам з тым беларускія легенды, відаць, не без уплыву біблейскіх сюжэтаў апавядаюць пра тое, што «ў панядзелак свет снаваўся». У старажытнай ведыйскай традыцыі панядзелак лічыўся днём ушанавання бога Хорсы.

◈ У рускіх прыказках, узятых, напрыклад, са слоўніка У. Даля, выкарыстоўваецца менавіта гэты алгарытм для ацэнкі панядзелка як ключавога, вызначальнага моманту, які мадэліраваў жыццё чалавека (яго справы, паводзіны, гаспадаранне) на ўвесь наступны тыдзень:

С понедельника деньги выдавать — всю неделю расход.

С понедельника на всю неделю — счастье или несчастье.

◈ Балгары таксама лічаць: калі ў панядзелак раніцай атрымаеш грошы, то ўвесь тыдзень будзеш іх атрымліваць, калі ж аддасі — увесь тыдзень вяртаць (аддаваць) будзеш.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	9.15	16.48	7.33
Віцебск	9.12	16.30	7.18
Магілёў	9.05	16.38	7.33
Гомель	8.53	16.43	7.50
Гродна	9.29	17.05	7.36
Брэст	9.21	17.14	7.53

Месяц

Маладзік 11 снежня.
Месяц у сузор'і Скарпіёна.

Імяніны

Пр. *Васіля, Георгія, Івана, Ілы, Мікалая, Пятра, Якава.*
К. *Леакадзіі, Наталлі, Яўхіма.*

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

ЗАЎТРА



...у суседзяў

ВАРШАВА	+3..+5°С	КІЕЎ	+1..+3°С	РЫГА	+6..+8°С
ВІЛЬНЮС	+4..+6°С	МАСКВА	+1..+3°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ	+3..+5°С

УСМІХНЕМСЯ

— Чаму вы пакінулі папярэдняе месца працы?

— Офіс кампаніі пераехаў, але мне не сказалі куды...

Першыя пяць дзён бацькоўства былі казачныя: віншаванні, «абмываніні». А потым жонку выпісалі з радзільні...

— Давай сёння ляжам спаць крыху раней?

— Ужо дзве гадзіны ночы.

— Не ўдалося.

Калі жонка выходзіла за мяне замуж, яна паабяцала, што ўсё жыццё будзе любіць толькі аднаго чалавека. Але потым высветлілася, што гэты чалавек — яе мама.



Малюнак Уладзіміра ЧУГПАЗАВА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значкам, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.035. Індэкс 63850. Зак. № 4951.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 8 снежня 2015 года.